ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ЗМЕНА НА АПЕРАТЫЎНА-ДЗЯЖУРНАЙ СЛУЖБЕ 4

СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК: АРЫЕНЦІР НА БЯСПЕКУ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЛІПЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 145 (29259)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КАРАНІК, міністр аховы здароўя:

«Пандэмія паказала, што дзякуючы пастаяннай пільнай увазе дзяржавы і асабіста Прэзідэнта, таму, што было зроблена за апошнія дзесяцігоддзі, беларуская сістэма аховы здароўя валодае высокай стрэсаўстойлівасцю. Яна здольная адказваць на самыя складаныя сучасныя выклікі. І не проста адказваць — захаваць сваю працаздольнасць: ні на хвіліну ў нашай краіне не спынілася аказанне экстраннай медыцынскай дапамогі».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Сістэма нашай нацыянальнай бяспекі створана намаганнямі ўсяго народа»

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка пабываў у воінскай часці 3214 унутраных войскаў МУС у сталічным мікрараёне Уручча

За апошні час журналісты пула наведалі з Прэзідэнтам некалькі часцей сіл спецыяльных аперацый. Кожная з іх прэтэндуе на званне асаблівай, але спецназ унутраных войскаў выдзеліўся: усе брыгады маюць свае сімвалы, але ні ў адной да гэтага часу сімвал не быў ажыўленым. Выява рысі «жыве» на шаўронах гэтай брыгады спецназа, а на тэрыторыі часці ў вальеры — сапраўдны жывы драпежнік. Па словах вайскоўцаў, гэта зроблена для таго, каб салдаты імкнуліся мець такія ж якасці, як і гэты звер, — спрытнасць, моц і трываласць. Усе гэтыя характарыстыкі байцы ўнутраных войскаў прадэманстравалі падчас візіту Прэзідэнта.

СТАР. 2

КАРАТКА

- **У Беларусі сёлета плануецца атрымаць 55 тысяч тон ільно-валакна.**
- «Гомельшкло» прапрацоўвае варыянты мадэрнізацыі вытворчасці.
- **Банкаўская карта з кэшбэкам на мабільную сувязь стала даступная для падключэння па ўсёй Беларусі.**

- «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Расію да 7 жніўня.
- **«Белгеадэзія» падрыхтавала тапаграфічны план Мінска і яго ваколіц.**
- Міжнародны пленэр «Заслаўскі Спас» пройдзе 18—19 жніўня.
- **БРСМ правядзе анлайн-квіз па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.**

ISSN 1990 - 763X

КІРМАШ ГУДЗЕ І СТРАКАЦІЦЬ...

У канцы ліпеня ва ўсіх гарадах пачынаюць працаваць традыцыйныя школьныя кірмашы, на якіх прадстаўлены ўсе патрэбныя вучням тавары. Малодшыя школьнікі ідуць па экіпіроўку да новага навучальнага года з бацькамі. А старэйшыя (асабліва дзяўчаткі) любяць пахадзіць па гандлёвых радах самастойна — бы дарослыя, прыцаніцца, памераць... Як, напрыклад, гэтыя гродзенскія старшакласніцы Вікторыя ВЯРСТАК, Настасся ПАЛАВЕНЯ і Арына РЫБІНСКАЯ.

Фота БелТА.

Сезон грыбоў і ягад

ПРУЖАНСКІЯ ЛІСІЧКІ ЕДУЦЬ У ПАРЫЖ СЛЕДАМ ЗА ЧАРНІЦАМІ

Як вядуцца нарыхтоўка і перапрацоўка лясных дароў на прыватным прадпрыемстве

Загадчыца сектара прыёмкі Аксана КОЎЧ.

Фота Сяргея ТАЛАШКЕВІЧА.

Вось гэта цікавы паварот! Дырэктар прыватнага прадпрыемства «Экалесапрадукт» Валерый БАЯРЫН згадзіўся пагаварыць з карэспандэнтам «Звязды» наконт будучага матэрыялу толькі пры ўмове, што газета раскажа, якія цудоўныя людзі працуюць у кампаніі. «Бо ў мяне ўсе найлепшыя, — кажа Валерый Вячаслававіч, — найлепшыя грузчыкі, найлепшыя нарыхтоўшчыкі, перабіральшчыцы, найлепшыя спецыялісты». Дык гэта, як той казаў, з задавальненнем.

Вядома, дырэктар лепш ведае пра свой калектыў. Тым больш што пачынаў вытворчасць Валерый Баярын фактычна з нуля дзесяць гадоў таму. У вёсцы Куплін пад Пружанамі знайшлі памяшканне былой ваеннай часці, якое доўга не выкарыстоўвалася. Там і арганізавалі нарыхтоўку ягад ды грыбоў. Першыя гады, вядома, аб'ёмы былі не такія, як цяпер: наймалі некалькі дзясяткаў нарыхтоўшчыкаў у раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Сёння тут пастаянна занята 15 чалавек, а ў сезон наймаецца яшчэ прыблізна 300 работнікаў.

СТАР. 9

«Сістэма нашай нацыянальнай бяспекі створана намаганнямі ўсяго народа»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Драпежнік», «Цунамі», «Волат», «Гарэза», «Ліс» — са знаёмства з імі пачалося наведванне кіраўніком краіны часці ўнутраных войскаў. Такія незвычайныя назвы атрымала ваенная тэхніка для правядзення спецыяльных аперацый. Тут і аўтамабілі для контртэрарыстычных аперацый, транспарціроўкі асабовага складу, абароны экіпажа ад агнястрэльнай зброі. Асабліва пахваліліся спецназаўцы «Рубяжом» — машынай з загараджальнай прыладай. Пры дапамозе разгорнутага шчыта такі аўта-трансформер забяспечвае франтальную абарону асабовага складу і транспартнага сродку ад уздзеяння розных цвёрдых і цяжкіх прадметаў. На пляцы быў разыграны эпізод тактыка-спецыяльных заняткаў па спыненні масавых беспарадкаў. Відовішча, безумоўна, уражвае. З аднаго боку пляцоўкі — экіпіраваныя правапарушальнікі, якія шпурляюць у бок вайскоўцаў бутэлькі з запальнай сумессю, петарды, дошкі. З другога — экіпіраваныя байцы са шчытамі, спецтэхнікай, зброяй, якія паступова прыціскаюць натоўп, адсоўваючы яго з пляцоўкі.

Дарэчы, яшчэ ў самым пачатку сустрэчы лідар краіны заўважыў, што бачыў кадры, як удзельнікі вулічных пратэстаў б'юць праваахоўнікаў. Такіх праяў агрэсіі, дадаў ён, дазваляць не трэба. «Хлопцы павінны разумець, што яны ў сваім доме. Нікому не дазволена іх штурхаць нагамі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён азнаёміўся таксама з бытавымі ўмовамі ў часці. На яе тэрыторыі пабудаваны інтэрнат для кантрактнікаў, які чакае навасёлаў у жніўні. Дзевяціпавярховы дом мае 142 жылыя памяшканні — 116 аднапакаёвых і 26 двухпакаёвых кватэр. У кожнай свая кухня, санвузел і ванная, таму назваць такое жыллё інтэрнатам складана. Будавалі дом для вайскоўцаў па дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме.

Ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў МУС забяспечваюць парадак на масавых мерапрыемствах, суправаджаюць афіцыйных асоб, сапёрна-піратэхнічныя падраздзяленні выязджаюць на паведамленні аб выяўленні выбуховых прылад. У красавіку ўнутраныя войскі ўзялі пад ахову асабліва важны аб'ект — БелАЭС.

Пасля знаёмства з тым, як абстаяць справы з падрыхтоўкай і забяспечанасцю ўнутраных войскаў, Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніцтвам і асабовым складам ведамстваў забеспячэння нацыянальнай бяспекі краіны.

Кіраўнік дзяржавы згадаў свае нядаўнія візіты ў іншыя вайсковыя часці — 38-ю дэсантна-штурмавую і 103-ю паветрана-дэсантную брыгады, 5-й асобную брыгаду спецназа, дзе ўбачыў добра аснашчаныя мабільныя воінскія падраздзяленні і «чарговы раз пераканаўся ў прадуманасці курсу на стварэнне ўласнай, надзейнай сістэмы нацыянальнай бяспекі».

Прэзідэнт нагадаў пачатак 1990-х гадоў, развал Савецкага Саюза і першыя крокі Беларусі ў суверэннае жыццё: «Тады бяздумна разбуралася сілавыя органы і ператваралася ў металалом баявая тэхніка. Масава звальняліся высакакласныя ваенныя прафесіяналы, вымушаныя дзеля пражытку сваіх сем'яў згаджацца на самую нізкаплатную працу. Грашовае забеспячэнне афіцэраў, якія засталіся ў армейскім страі, скарацілася ў некалькі разоў. Камандзір узвода ў тыя гады атрымліваў 15 долараў у эквіваленце, а камандзір палка — 35».

Беларусь выстаяла і абрала, па словах лідара краіны, верныя арыенціры. «І можна сказаць — ***сістэма нашай нацыянальнай бяспекі створана намаганнямі ўсяго нашага народа. Нам ніхто нічога не падарыў, і мы нікому нічым не абавязаны»,*** — падкрэсліў ён.

Больш за тое, абаронны патэнцыял краіны пастаянна ўмацоўваецца, заявіў кіраўнік дзяржавы. «Невыпадкова па даных штогадовага міжнароднага рэйтынга ваеннай моцы (рэйтынг Global Fiгepower (GFP). — «**Зв.**») армія Беларусі сёння займае 53-е месца сярод амаль 140 краін. Гэта значна вышэй за большасць дзяржаў СНД, у тым ліку супастаўных па насельніцтве», — паведаміў Прэзідэнт. ***«Мы вельмі шмат зрабілі за гэты час для Узброеных Сіл, і гэты падыход робіць нас мацнейшымі,*** — заўважыў ён. — Мы паспяхова процідзейнічаем незаконнай міграцыі, наркатрафіку і кантрабандзе».

Прэзідэнт заўважыў, што сёлетні няпросты год падсвяціў многія праблемы. Разам з тым ён звярнуў увагу аўдыторыі на тое, што ***сёння галоўны клопат і сілавога блока краіны, і самога Прэзідэнта — захаваць стабільнасць у Беларусі.***

«Гэта наша з вамі найважнейшая і найпершая задача», — акцэнтаваў ён.

Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Пашана

НЕ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ, А ПРЫЗВАННЕ

На ахову здароўя Беларусі праз каранавірус прыйшлася сур'ёзная нагрузка, але сістэма ў сціслыя тэрміны перабудавалася на вырашэнне новых задач.

Пра гэта заявіў **кіраўнік урада Раман ГАЛОЎЧАНКА** падчас урачыстага ўзнагароджання медыкаў Мінскай вобласці.

«Дакладна працуючы як адзіны зладжаны механізм, вы з гонарам справіліся, спраўляецеся з беспрэцэдэнтнай па маштабе і складанасці задачай», — падзякаваў медыкам Раман Галоўчанка.

Фота БелТА.

Па словах прэм'ера, перамогу над каранавірусам святкаваць зарана, пакуль у свеце назіраецца павелічэнне колькасці захварэлых, але нацыянальная сістэма аховы здароўя прадэманстравала ўстойлівасць і гатоўнасць да самых няпростых выпрабаванняў.

«Гэта быў для нас добры ўрок і добрая навука, як трэба рэагаваць на падобныя выклікі. Я думаю, вы пагодзіцеся, што за ўсім гэтым стаіць стабільнасць дзяржаўнай сістэмы, непахіснасць сацыяльнай накіраванасці палітыкі, якая праводзіцца кіраўніком дзяржавы, і, вядома, ваша штодзённая напружаная праца і самая высокая самаддача», — звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі прэм'ер-міністр.

Кіраўнік урада ўручыў медаль «За працоўныя заслугі», падзякі Прэзідэнта Беларусі і прэм'ер-міністра, ганаровыя граматы і падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта. Павіншавалі медыкаў і ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Беларусі, падзякай старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, знакамі «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».

Удзел у цырымоніі таксама ўзялі **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН і першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.**

Ад імя медыцынскіх работнікаў **урач-інфекцыяніст, загадчык інфекцыйнага аддзялення Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бальніцы Алег ЕЛІН** выказаў спадзяванне, што хутка каранавірус будзе пераможаны.

Варвара МАРОЗАВА.

Выбары-2020

Ніякай «плотавай» сацыялогіі

На выбарах Прэзідэнта Беларусі 9 жніўня больш чым на трохсот участках па ўсёй краіне будзе праводзіцца экзітпол.

Пра гэта паведаміў учора падчас прэс-канферэнцыі і прэзентацыі апытання на выхадзе з выбарчых участкаў **навуковы кансультант, кандыдат сацыялагічных навук Ігар ПІНЧУК.** Задзейнічана будзе каля тысячы інтэрв'юераў, а ўсяго плануецца апытаць больш за дванаццаць тысяч выбаршчыкаў.

Кожная група, якая працуе на экзітполе, будзе складацца з трох чалавек. Апытанне працягнецца ўвесь дзень. Інтэрв'юеры будуць знаходзіцца за 10-15 метраў ад выбарчага ўчастка, што дазволіць вытрымаць неабходны крок пры адборы рэспандэнтаў.

Для інтэрв'юераў ужо падрыхтавана ўсё неабходнае. Адрозніць іх можна будзе па адмысловай форме адзення з лагатыпам, бэйджы, брэндзіраванай сумцы, планшэце, кепцы і значку. З улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі інтэрв'юеры будуць насіць маскі і пальчаткі.

Вынікі экзітполу друкуюцца не раней чым праз дваццаць хвілін пасля закрыцця ўчасткаў для галасавання і да агучвання афіцыйных вынікаў. У ідэале арганізатары імкнуцца да хібнасці ў два працэнты, але ў міжнароднай практыцы яна дапускаецца да пяці працэнтаў.

Праводзіць экзітпол будзе Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, якая атрымала станоўчы досвед падчас кампаній у 2010 і 2015 гадах. Наглядаць за правільнасцю правядзення апытання будуць міжнародныя і нацыянальныя эксперты.

«У грамадства, якое стамілася ад «плотавай» сацыялогіі, як нікалі вялікі попыт на аб'ектыўныя даследаванні», — упэўнены **дырэктар прадстаўніцтва Міждзяржаўнай кампаніі «Мір» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ,** чыя кампанія выступіла ініцыятарам правядзення даследавання.

Варвара МАРОЗАВА.

Меркаванне

Ёсць нагода ганарыцца малой радзімай і краінай у цэлым

Міхаіл СТРАПКО, дырэктар ААТ «Відамлянскае» Камянецкага раёна, старшыня Брэсцкага абласнога аграпрамысловага саюза:

— У нас поўным ходам ідзе ўборка збожжавых. Гэта зараз галоўны клопат аграрыяў. У цэлым, я сказаў бы, настрой вясковых працаўнікоў пазітыўны: мы жывём, працуем, ганарымся сваёй краінай.

«Відамлянскае» — адна з самых буйных гаспадарак у раёне. Сёння ў склад сельгаспрадпрыемства ўваходзіць 39 вёсак, якія аб'яднаны ў тры сельсаветы. На сваёй тэрыторыі мы маем школы, дзіцячыя садкі, шэраг устаноў культуры і аховы здароўя. І ніколі не лічылі гэтыя аб'екты «чужымі» для гаспадаркі, бо там вучацца, лечацца, адпачываюць нашы работнікі, а таксама іх бацькі і дзеці. Мы не забываем ветэранаў калгаснай вытворчасці, заўсёды іх падтрымліваем перад святамі і памятнымі датамі. Літаральна нядаўна віншавалі з 70-годдзем былую трактарыстку Галіну Васілеўну Іванюк. Лічу гэта важным як для саміх ветэранаў, так і для маладых членаў калектыву, якія вучацца шанаваць традыцыі ды паважаць старасць.

Сёння можна многа сказаць пра жыццё сучаснай вёскі на нашым прыкладзе. Галоўнае, што ў людзей ёсць магчымасць працаваць, будаваць жыллё, ствараць дабрабыт уласных сем'яў. Пра апошняе сведчыць эканамічны стан гаспадаркі. Напрыклад, па выніках чэрвеня сярэдняя зарплата работнікаў перавысіла 1000 рублёў. Значыць, нашы земляробы, жывёлаводы могуць спакойна вучыць дзяцей, разлічвацца па крэдытах, планаваць пакупкі і адпачынак. А для таго каб жыццё было камфортным у сельскіх населеных пунктах, вялікая работа праводзіцца па добраўпарадкаванні, і адкрытае акцыянернае таварыства заахвочвае гэтую дзейнасць. Мы заўсёды прысутнічаем на святах нават самых маленькіх вёсак, і не толькі ў якасці спонсараў узнагарод за прыгожы падворак, знаходзім магчымасць адзначыць перад землякамі сваіх найлепшых работнікаў. Таксама выдзяляем сродкі на добраўпарадкаванне цэнтральнай сядзібы — аграгарадка Відамля, — і кожнай фермы, кожнага мехдвара. Калі чалавек штодня працуе ў атмасферы парадку і камфорту, у яго будзе лепшы настрой і з'явіцца дадатковая нагода ганарыцца малой радзімай.

Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.

Свая справа

ФЕРМЕР-ПРАДПРЫМАЛЬНІК...

...вырошчвае садавіну і агародніну, займаецца аграэкатурызмам, атрымлівае льготы

Фермерскія гаспадаркі Беларусі сёння дэманструюць дынамічнае развіццё. Зямельныя ўчасткі вясковых прадпрымальнікаў за апошні час выраслі ў сярэднім з 50 да 90 гектараў, а ўсяго фермеры апрацоўваюць 150 тысяч гектараў ворных зямель. Пры гэтым 90 % гаспадарак займаюцца раслінаводствам, аднак яны будуць узбуйняцца і набываць спецыялізацыю, у тым ліку ў кірунках аграэкатурызму і арганічнай сельскай гаспадаркі. Такімі лічбамі і прагнозамі дзяліліся на прэс-канферэнцыі эксперты галіны.

Безакцызнае паліва і крэдыт на жыллё на 40 гадоў

Пра развіццё фермерскіх гаспадарак у краіне сведчаць дакладныя лічбы. Летась 2790 фермераў, у якіх працуе каля 8800 чалавек і якія займаюцца выключна вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі, стварылі яе на 556 мільёнаў рублёў. Гэта 2,7 % ад агульнага аб'ёму сельскагаспадарчай вытворчасці краіны ўсімі катэгорыямі грамадзян. Для параўнання, у 2016-м у Беларусі было каля 2500 фермерскіх гаспадарак, дзе працавала 7500 чалавек, якія выдалі 1,9 % прадукту, падзялілася інфармацыяй **Алена ЦЫКУНОВА, начальнік упраўлення дзяржаўнай уласнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:**

— Дзяржава аказвае пэўную падтрымку для развіцця фермерскага сектара. Паколькі фермерскія гаспадаркі — юрыдычныя асобы, то яны сёння нароўні з буйнатаварнымі сельгасвытворцамі могуць удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах дзяржаўнай праграмы аграпрамысловага комплексу. Гэта і развіццё племянной справы, і вырошчванне пладовых і ягадных культур, і першапачатковае ўладкаванне зямельнага ўчастка (будаўніцтва дарог, падвядзенне газу, меліярацыя). Сёлета па гэтых мерапрыемствах заяўлена і праведзена конкурсаў на 4,5 мільёна рублёў. Летась фермеры заплацілі дзяржаве 4,4 мільёна рублёў падаткаў, а атрымалі па мерапрыемствах дзяржпраграмы — 2,2 мільёна.

У якасці дзяржпадтрымкі фермеры могуць таксама атрымліваць дызельнае безакцызнае паліва, набываць на льготных умовах тэхніку ў лізінг, заявіць жаданне на крэдыт для будаўніцтва жылля на 40 гадоў пад 3 % гадавых з адтэрміноўкай плацяжоў на тры гады.

Нерухомасць за адну базавую і дармавая арэнда

Сёння ў краіне прадаецца больш за тысячу аб'ектаў маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, прычым каля 300 з іх аддаюць за адну базавую велічыню. Пераважна яна знаходзіцца ў сельскай мясцовасці і ўяўляе сабой былыя аб'екты сацыяльнай сферы: акушэрскія пункты, школы, клубы.

Летась, са ўступленнем у сілу ўказа Прэзідэнта № 169, яшчэ больш спрасціліся падыходы да выканання ўмоў пры продажы такіх аб'ектаў, расказала **Жанна ПАДАБЕДАВА, начальнік упраўлення па рабоце з дзяржаўнай маёмасцю галоўнага ўпраўлення распараджэння маёмасцю Дзяржкамітэта па маёмасці:**

— Набываючы аб'ект за адну базавую, пакупнік павінен выканаць адну ўмову: у пэўны тэрмін распачаць на аб'екце прадпрымальніцкую дзейнасць, перабудаваць яго пад жыллё ці вядзенне падсобнай гаспадаркі, або аформіць пад знос. Змянілася таксама норма па забеспячэнні растэрміноўкі пры продажы дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, на тэрмін да пяці гадоў. Прычым тэрмін вызначае сам пакупнік падчас заключэння дагавора куплі-продажу.

Яшчэ адна навела ўказа № 169 дазволіла выстаўляць на продаж за адну базавую адразу ўсе аб'екты, якія не выкарыстоўваюцца, акрамя такой нерухомасці ў сталіцы і абласных цэнтрах. Нароўні з продажам на аўкцыёне такую маёмасць можна перадаваць бязвыплатна ў прыватную ўласнасць, калі мяркуецца нейкі інвестыцыйны праект, або здаваць у дармавую арэнду пад стварэнне рабочых месцаў.

Пры падзеле зямлі — шукаць кампраміс

У галіне зямельных адносін у частцы спрашчэння і патаннення працэдуры афармлення сялянска-фермерскімі гаспадаркамі (СФГ) землеўпарадкавальных матэрыялаў, неабходных для вызвалення і выдзялення зямельных участкаў, праекты адводу з 2018 года, згодна з указам Прэзідэнта № 463, распрацоўваюць непасрэдна структурныя падраздзяленні землеўпарадкавання мясцовых выканаўчых улад. Гэта значыць, што фактычна ўвесь комплекс па афармленні неабходных дакументаў для адводу зямлі фермерскай гаспадаркі для яе ўладальніка бясплатны, растлумачыў **Сяргей КАСТРОЎ, начальнік упраўлення землеўпарадкавання Дзяржкамітэта па маёмасці:**

— Адзінае выключэнне — калі былы карыстальнік зямлі, якая адводзіцца новаму ўладальніку, заяўляе, што ён нясе страты. Тады новы гаспадар аплачвае кошт страт, які разлічвае зямельная служба. Пытанні з набыццём зямлі, тым не менш, узнікаюць. Напрыклад, фермерскую гаспадарку рэгіструюць у раёне, а ў выдзяленні зямлі (у тым ліку для пашырэння надзела) ёй чамусьці адмаўляюць. Такія праблемы трэба вырашаць сумесна з аблвыканкамамі, Мінсельгасам і з намі, асабліва калі адмовы неабгрунтаваныя.

Перш чым забраць прывабны кавалак зямлі ад аднаго руплівага гаспадара (калгаса) і перадаць іншаму добраму ўласніку (фермеру), трэба ўзважыць усе «за» і «супраць» і дамовіцца, каб не было канфлікту інтарэсаў, падкрэсліў спецыяліст. Летась дадаткова выдзеленых зямель больш за ўсё было ў Магілёўскай вобласці (6000 гектараў). А вось самай «праблемнай» у гэтым плане аказалася Мінская (1500 гектараў).

На плантацыі лаванды, якую ў Веткаўскім раёне вырошчвае фермер Алег Дабуляк.

Фота БелТА.

Многія фермерскія гаспадаркі цяпер з'яўляюцца паўнавартаснымі буйнатаварнымі вытворцамі, адзначыў **Андрэй ПІЛІПУК, дырэктар Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі:**

— Малыя формы гаспадарання паспяхова развіваюць таксама і нетрадыцыйныя віды дзейнасці, напрыклад, такія як аграэкатурызм і арганічная сельская гаспадарка. Некаторыя арганізацыі нават сертыфікаваліся ўжо як вытворцы арганічнай прадукцыі. 11 з іх спецыялізуюцца на раслінах, дзве — на жывёлагадоўлі.

Усяго ў Беларусі цяпер налічваецца 3042 фермерскія гаспадаркі. Летась зарэгістраваліся яшчэ 200 новых СФГ, а 99 — самастойна спынілі дзейнасць.

Ірына СІДАРОК.

Навука

ПРА ЎСЁ РАСКАЖА ДНК

У Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук пасля двухгадовай мадэрнізацыі адкрыўся Рэспубліканскі цэнтр геномных біятэхналогій. Тут з'явілася дзесяць лабараторый з самым сучасным навуковым абсталяваннем. Цяпер цэнтр цалкам адпавядае сусветным патрабаванням, што прад'яўляюцца да ПЦР-лабараторый. Усё гэта створыць прынцыпова новыя магчымасці: колькасць генных даследаванняў падвоіцца, генетычныя пашпарты стануць больш даступнымі, а таксама будуць забяспечаны спрыяльныя ўмовы для міжнароднага супрацоўніцтва.

Намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ расказаў, што ўжо сёння наладжана актыўнае ўзаемадзеянне з урачамі, спецыялістамі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, крыміналістамі, селекцыянерамі і спартсменамі.

— Спецыялісты лабараторый цяпер выконваюць саюзную праграму «ДНК-ідэнтыфікацыя», якая складаецца з двух кірункаў: крыміналістыка (пошук злачынцаў на аснове даных малекулярнай генетыкі, вывучэнне генетыкі знешнасці, узросту, псіхічных асаблівасцяў) і медыцынская генетыка. Абсталяванне ў мадэрнізаваным цэнтры ўнікальнае і дарагое — каб на ім працаваць, нашы супрацоўнікі вучыліся ў Германіі, Вялікабрытаніі і ЗША. У планах праграма «ДНК-ідэнтыфікацыя — 2», па якой мы будзем вывучаць не толькі чалавека, але і біялагічныя аб'екты, што могуць быць асновай эканамічных злачынстваў, такіх, напрыклад, як фальсіфікацыя мясных або рыбных прадуктаў, крадзеж драўніны.

Геномныя біятэхналогіі лічацца вельмі перспектыўнымі ва ўсім свеце і актыўна развіваюцца. Даследаванні беларускіх навукоўцаў не саступаюць замежным, упэўнены **старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ:** «У нас магутная біятэхналагічная навука. Адкрыццё мадэрнізаванага цэнтра дасць магчымасць выйсці на новы ўзровень у галіне вывучэння генома чалавека, раслін і жывёл».

Сёння ў цэнтры аказваюцца паслугі па генетычным тэсціраванні схільнасці да больш чым 20 сацыяльна значных захворванняў. Гэта і сардэчна-сасудзістыя, і астэапароз, і дыябет 2-га тыпу, і трамбафілія, і іншыя. Акрамя таго, сталі магчымымі вызначэнне індывідуальных генетычных асаблівасцяў метабалізму вітамінаў, алкаголю, халестэрыну, старэння скуры, стану валасоў, расшыфроўка поўнага геному чалавека. Гэтыя веды дазваляюць правесці раннюю дыягностыку паталогій, вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна падабраць метады прафілактыкі і лячэння. Цяпер у лабараторыі генетыкі чалавека можна прайсці генетычнае тэсціраванне і даследаваць 60 самых важных генаў, а пасля — атрымаць асабісты генетычны пашпарт. У цэнтры іх зрабілі ўжо больш чым для 16 тысяч беларусаў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СААЗ назвала пандэмію каранавіруса «адной вялікай хваляй»

У Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) пракаментавалі новыя ўспышкі каранавіруса ў Паўночным паўшар'і, заявіўшы, што пандэмія з'яўляецца «адной вялікай хваляй» і не носіць сезоннага характару. Пра гэта паведамляе Reuters.

У СААЗ адзначылі, што, у адрозненне ад грыпу, каранавірус не мае тэндэнцыю выяўляцца сезонна. «Людзі ўсё яшчэ думаюць пра поры года. Нам усім варта зразумець, што гэта новы вірус і ён паводзіць сябе па-іншаму», — сказала Маргарэт Харыс на віртуальным брыфінгу ў Жэневе ў аўторак. Яна заклікала праяўляць пільнасць для запаволення перадачы віруса, які распаўсюджваецца праз масавыя сходы.

«Гэта будзе адна вялікая хваля. Яна будзе падымацца і крыху апускацца. Лепш за ўсё згладзіць яе і ператварыць у нешта, што будзе плёскацца каля вашых ног», — дадала яна.

Раней у СААЗ прызналі бессэнсоўным закрыццё граніц падчас пандэміі каранавіруса. З такой заявай выступіў дырэктар праграмы арганізацыі па НС у галіне аховы здароўя Майкл Раян.

Паводле інфармацыі праекта Універсітэта Джонса Хопкінса, агульная колькасць тых, хто заразіўся каранавірусам у свеце, раніцай 28 ліпеня перавысіла 16,4 мільёна чалавек. Пандэмія ахапіла 188 краін.

Google пракладзе па дне акіяна оптавалаконны кабель з ЗША ў Еўропу

Кампанія Google абвясціла пра пачатак пракладкі падводнага оптавалаконнага кабелю Grace Hopper з ЗША ў Іспанію і Вялікабрытанію. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным у аўторак прэс-рэлізе кампаніі.

Інтэрнэт-кабель Grace Hopper, названы ў гонар амерыканскай вучонай у галіне праграмавання, звяжа ЗША з Вялікабрытаніяй і Іспаніяй і забяспечыць «лепшую ўстойлівасць сеткі, якая ляжыць у аснове прасоўвання спажывецкіх тавараў і карпаратыўных прадуктаў Google».

Па звестках карпарацыі, Grace Hopper стане першым у гісторыі Google інтэрнэт-кабелем, які злучыць ЗША і Іспанію. Акрамя таго, адзначаецца ў рэлізе, гэты праект стане першай інвестыцыяй Google у прыватны падводны кабельны маршрут у Вялікабрытанію.

Даўжыня Grace Hopper будзе складаць 6250 кіламетраў ад ЗША да Вялікабрытаніі і 6300 кіламетраў — ад ЗША да Іспаніі. Google мае ў сваім распараджэнні кабелі, якія злучаюць Партугалію і ПАР, а таксама ЗША і Францыю.

Кітайскія медыкі выратавалі жанчыну, у якой на тры дні спынілася сэрца

23-гадовая жыхарка кітайскага горада Сіянь, правінцыя Шэньсі, часта не спала дапазна, у выніку імунная сістэма яе арганізма аслабла. У сярэдзіне ліпеня яна прастудзілася, што прывяло да фульмінантнага міякардыту, у выніку якога здарыўся кардыягенны шок.

Калі сэрца пацыенткі перастала біцца, урачы экстранна ўжылі да яе альтэрнатыўны метад насычэння крыві кіслародам — экстракарпаральна-мембранную аксігенацыю, каб забяспечыць ёй дыханне і падтрымаць дзейнасць сэрца. Праз тры дні балансавання на мяжы жыцця і смерці сардэчная функцыя кітаянкі аднавілася, паведамляе выданне Global Times.

Увесь час, пакуль яе сэрца не білася, жанчына заставалася ў прытомнасці і размаўляла з навакольнымі людзьмі. Яна была на здзіўленне ў добрым настроі і адпраўляла паведамленні сябрам, апавядаючы пра свой дзіўны вопыт.

Такая служба

«ЗМЕНА ЧЫМСЬЦІ НАГАДВАЕ БЛІЦ У ШАХМАТАХ...»

Аператыўна-дзяжурная служба — адзін з самых няпростых участкаў дзейнасці міліцыянераў. Што ні здарыцца ў горадзе — са сваімі бедамі людзі ідуць перш за ўсё сюды. Наколькі ж складана ў ёй працуецца?

Старшы аператыўны дзяжурны, падпалкоўнік міліцыі Аляксандр КАЖУРА служыць у гэтым падраздзяленні Фрунзенскага РУУС сталіцы вось ужо амаль чатырнаццаць гадоў. Да таго дзесяць гадоў правёў у атрадзе міліцыі асобага прызначэння.

— Шчыра кажучы, да арміі нават і не думаў, што стану міліцыянерам. Нават не было каго спытаць пра службу. Гэта цяпер інтэрнэт пад рукой, а ў пачатку 1990-х адзінай крыніцай падобнай інфармацыі былі сваякі і знаёмыя. А ніхто з іх у міліцыі не служыў. Калі быў у звальненні падчас службы, пабачыў, як на чыгуначным вакзале працуюць супрацоўнікі атрада міліцыі асобага прызначэння. Якраз у гэты час у іх з'явілася новая форма, якая ўражвала, ды і само падраздзяленне было легендарнае. Да таго ж у маім вайсковым падраздзяленні за паўгода да звальнення ў запас некалькі чалавек паспрабавалі прайсці адбор у АМАП. Ні ў кога з іх не атрымалася. Пасля вырашыў праверыць свае сілы сам — і іспыт здаў.

Аляксандр Кажура адслужыў у АМАП 10 гадоў. Упершыню прымераў там афіцэрскія пагоны, пасля таго як скончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў. Штуршком да перамены характару работы сталі змены ў асабістым жыцці. Патрабаваўся ўжо іншы графік — таму Аляксандр Кажура і перавёўся ў Фрунзенскае РУУС.

— Я думаў, што тут будзе больш руціны. Нічога падобнага. Насельніцтва Фрунзенскага раёна — паўмільёна чалавек. Фактычна яно супастаўнае з другім па велічыні горадам Беларусі — Гомелем. Ды і новыя дамы пастаянна будуюцца. Таму і колькасць зваротаў у аператыўна-дзяжурную службу вельмі высокая. Вольнага часу тут амаль не бывае. Фактычна 24-гадзінная змена чымсьці нагадвае «бліц» у шахматах. Сеў за пульт, націснуў кнопку — і пайшлі адзін за другім выклікі. Толькі ўначы іх становіцца менш.

Мая асноўная задача — быць, па сутнасці, камандным цэнтрам падчас раскрыцця злачынства. Гэта значыць акумуляваць сабраную інфармацыю, прымаць рашэнне, каго накіраваць, пракантраляваць, як працуе следча-аператыўная група на месцы, прасачыць, якія доказы сабраны на месцы падзей.

Галоўная задача аператыўна-дзяжурнай службы — спрыяць таму, каб процізаконны ўчынак быў раскрыты «па гарачых слядах». Канешне, калі гэта патрабуе прыцягнення вузкіх спецыялістаў, дамагчыся такога выніку складана. Але калі гаворка ідзе пра вулічнае злачынства ці кватэрны крадзеж — то атрымліваецца менавіта «па слядах».

«А РАНІЦАЙ ЯНЫ ПРАЧНУЛІСЯ»

Гістарычна склалася, што ў Фрунзенскім раёне няшмат буйных прадпрыемстваў. Асноўная іх частка сканцэнтравана на процілеглых канцах горада. Можна сказаць, што гэта, па сутнасці, адзін вялікі спальны раён. Такая акалічнасць уплывае на спецыфіку злачынстваў і інцыдэнтаў.

— Для нас самы напружаны час на працягу сутак — з 7 гадзін вечара да 2 ночы. Падчас яго адбываецца асноўная маса сямейна-побытавых скандалаў. Калісьці ў Фрунзенскім раёне па нагружанасці любую суботу можна было параўнаць з 1-м студзеня. Гэта з-за таго, што ў нашым грамадстве чамусьці існуе звычка адзначаць са спіртным канец чарговага працоўнага тыдня. Раніцай пасля чарговай такой гулянкі прачынаецца гаспадар кватэры — і не знаходзіць нейкіх каштоўных рэчаў. Тады звяртаецца да нас. Цяпер жа нейкай залежнасці ад дня тыдня няма, усё больш-менш нівелявана. І самыя страшныя злачынствы — тыя, якія адбываюцца за зачыненымі дзвярыма.

ЦЕЛЫ Ў МАРАЗІЛЬНІКУ

У чэрвені інтэрнэт абляцела жахлівая навіна — у адной з кватэр былі знойдзены целы двух дзяцей. Адно з іх было на балконе, другое — у маразільніку. Калі прыехала следча-аператыўная група, 40-гадовая маці імкнулася яго схаваць. Была заведзена крымінальная справа. Якраз гэты выпадак выпаў на дзяжурства Аляксандра Кажуры.

— Дзесьці гадоў пяць таму здарыўся падобны інцыдэнт. У РУУС прыйшоў моцна ўсхваляваны чалавек і сказаў: я прыехаў да вас на аўтамабілі, у багажніку якога ляжаць дзіцячыя трупы. Адправілі мы туды супрацоўнікаў паглядзець, што там такое адбываецца. Яны пацвердзілі — так, там ляжаць замарожаныя тушкі птушак, а побач з імі — два цельцы. Але тады ніякага крыміналу не адбылося. Судова-медыцынская экспертыза вынесла свой вердыкт — гэта выкідышы. Узнікла лагічнае пытанне: як жа целы апынуліся дома? Пачалося разбіральніцтва. Высветлілася, што сужыцелька чалавека, які звярнуўся ў міліцыю, двойчы зацяжарвала, але вынасіць плод не здолела. Прычым па медыцынскую дапамогу яна не звяртала-

З саслужыўцам у войску.

Фота з архіва героя.

ся, а проста складвала целы ў маразільнік. Вось чарговы спадарожнік жыцця выпадкова і знайшоў іх. І павёз жудасны груз да нас...

СТРАШНАЯ ТАЙНА МІНСКАЙ КВАТЭРЫ

— У аператыўныя дзяжурныя не бяруць людзей без досведу работы ў міліцыі, — працягвае Аляксандр Кажура. — Справа ў тым, што за 30—60 хвілін ты можаш атрымаць як тры, так і дзесяць паведамленняў. За суткі колькасць зваротаў становіцца трохзначнай. Прыкладна палова выклікаў патрабуе неадкладнага выбыцця групы — затрымання або следча-аператыўнай.

Трэба кіраваць нарадамі, перадаваць прыкметы ў эфір, калі гэта неабходна. Але ж і іншыя злачынствы таксама не «чакаюць». І на прыняцце рашэння выпадаюць часам долі секунды. На сыходзе сутак стомленасць ужо сапраўды прысутнічае. І вось калі едзеш дадому, то ў думках праганяеш яшчэ раз мінулыя 24 гадзіны. Аналізуеш і наступны раз працуеш з улікам атрыманага досведу. Канешне, ёсць ведамасныя загады, як дзейнічаць у выпадку якога-небудзь злачынства. Гэта ўсё ўдасканалена гадамі. Па шаблоне працаваць, зразумела, увесь час ты не здолееш, але ў патрэбнае рэчышча гэта кіруе.

Суразмоўца згадвае жудасную гісторыю, якая здарылася ў пачатку яго службы ў Фрунзенскім РУУС. Неяк у дзяжурную часць звярнулася жанчына, якая паведаміла, што яе пляменніца з нейкай прычыны не прыехала на вяселле, ды і дома яе няма ўжо працяглы час. Бацька зніклай тлумачыў, што дачка выехала на вакзал. Здавалася б, адбыўся шараговы выпадак — чалавек знік без вестак. Як заўжды ў такім выпадку, былі ўзяты тлумачэнні, прынята заява, а на месца жыхарства чалавека паехала следча-аператыўная група. А праз некаторы час адтуль раздаўся вельмі дзіўны званок.

Супрацоўнік крымінальнага вышуку расказаў, што сітуацыя незразумелая. У пакоі дзяўчыны надарваны шпалеры. Бацька паводзіць сябе неяк падазрона і сцвярджае, што ў кватэры ідзе рамонт. Але ў іншых памяшканнях нічога падобнага не было! Гэтая акалічнасць выклікала падазрэнне, і быў тэрмінова запрошаны судовы эксперт са спецыяльнай лямпай. Яна і паказала, што ўся кватэра была літаральна залітая крывёю, а з пакоя ў ванну спецыяліст заўважыў сляды валачэння. Бацька маўчаў. З'явілася версія забойства з расчляненнем. Нарады міліцыі прачэсвалі тэрыторыю на месцы цяперашняй Дамброўкі — у той час там былі толькі пусткі і рэшткі агародаў. Праз тыдзень знайшлі ўсе часткі цела. Пасля аказалася, што гэта бацька падчас канфлікту забіў дачку, а цела расчляніў і ўсё падаў так, нібыта яна сама з'ехала кудысьці.

— Пры гэтым трэба зазначыць, што вулічнай злачыннасці з цягам часу становіцца меней. Рабункі, разбоі — для нашага раёна гэта рэдкасць на фоне таго, што было яшчэ хоць дзесяць гадоў таму. Ахвярамі тады станавіліся ўладальнікі дарагіх мабільных тэлефонаў. Цяпер жа злачыннасць пакрысе сыходзіць у інтэрнэт. Канешне, крадзяжы з аўтамабіляў ёсць і дагэтуль, і, на жаль, нікуды яны не падзенуцца — у любы час будуць аматары пажывіцца чужым дабром. Ці вось нярэдка абкрадаюць п'яных: выпіў чалавек, ішоў дадому, заснуў на прыпынку ці пад кусцікам, прачнуўся, а кашалька пры ім больш няма.

«Гістарычна склалася, што ў Фрунзенскім раёне няшмат буйных прадпрыемстваў. Асноўная іх частка сканцэнтравана на процілеглых канцах горада. Можна сказаць, што гэта, па сутнасці, адзін вялікі спальны раён. Такая акалічнасць уплывае на спецыфіку злачынстваў і інцыдэнтаў».

Работа аператыўнага дзяжурнага амаль заўсёды звязана з чалавечым горам. Разам з тым рэдка, але знаходзіцца час і для гумару. Напрыклад, аднойчы паступіў выклік, што каля вуліцы Якубоўскага на снезе ляжыць тыгр. Першая ж думка — жывёла збегла з заапарка. А калі прыехаў нарад міліцыі, то высветлілася, што гэты тыгр насамрэч... цацачны. Проста яго памеры і афарбоўка былі такія ж, як у жывой істоты.

НЕЗВЫЧАЙНАЕ ХОБІ

У Аляксандра Кажуры ёсць два хобі. Праз усе гады службы ў сілавых структурах ён пранёс юнацкую цікавасць да сельскай гаспадаркі і... кухарскай справы.

— Я калісьці хацеў паступаць у Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Але бацькі пераканалі ў адваротным, ды і сам пасля неяк крыху «падастыў» да гэтай тэмы. Калі ажаніўся, пераехаў на пастаяннае месца жыхарства са сталіцы ў іншы горад, у прыватны дом. Там разам з жонкай я займаюся развядзеннем трусоў, курэй. Хутка планую завесці авечак.

Аляксандр Кажура прызнаецца, што вельмі любіць гатаваць. З асаблівай павагай ён ставіцца да страў французскай кухні. Падпалкоўнік міліцыі пералічвае тое, што не раз ствараў сваімі рукамі: гратэн, фандан, бешамель... Гэтае захапленне яўна большае за аматарскі ўзровень.

І будзем спадзявацца, што ў афіцэра ўсё атрымаецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота дадзена Фрунзенскім РУУС Мінска.

«Мая задача як бацькі — выхаваць дзяцей добрымі людзьмі»

«Дзяцей з радзільні выпісвалі па чарзе. Я два месяцы быў у дэкрэтным адпачынку, пакуль усіх дома дачакаўся», — згадвае падзеі шасцігадовай даўніны маёр міліцыі Андрэй АБРАМОВІЧ. — На службе да сітуацыі паставіліся з разуменнем. А як інакш? Не кожны дзень у калегі трайняты нараджаюцца!



Андрэй Міхайлавіч — старшы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі. Мужчыне — 41 год, 17 з якіх працуе ў Заводскім РУУС сталіцы:

— Прыйшоў сюды пасля арміі, служыў ва ўнутраных войсках. Калі мяне пытаюць, кім яшчэ мог стаць, паціскаю плячыма. Нават уявіць сябе без формы цяжка.

І гэта нягледзячы на тое, што пасля школы Андрэй Міхайлавіч скончыў Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, факультэт тэхнічнага сэрвісу ў АПК. Своечасова зразумеў — не яго.

— Першы рабочы дзень у міліцыі запомніўся. Было шмат новай інфармацыі, а новае заўсёды здаецца складаным. З вопытам усё становіцца на свае месцы, — упэўнены суразмоўца.

Згадвае маёр і тое, як пазнаёміўся з будучай жонкай. Пару звяла менавіта служба:

— Працаваў тады ўчастковым інспектарам міліцыі. Пайшоў правяраць вартавую ахову хлебазавода. З будынка выйшла дзяўчына — прыгожая, загарэлая. Як высветліў пазней, яна толькі прыехала з мора. Таццяна — інжынер-тэхнолаг.

Праз год маладыя людзі пажанілася. Вяселле было пышнае, каля 160 гасцей паклікалі! Святкавалі на малой радзіме жаніха.

— Гуляла, як кажуць, уся вуліца. Гэта цяпер мода пайшла на ціхія сціплыя вечары ў коле сям'і. Раней было інакш, — кажа міліцыянер.

На пытанне, колькі жывуць у шлюбе, Андрэй Міхайлавіч, як і большасць мужчын, задумваецца:

— Зараз падлічу, — усміхаецца. — Разам мы ўжо 12 гадоў.

Андрэй Міхайлавіч і Таццяна Валер'еўна выхоўваюць двух сыноў і дачку.

— Мы з жонкай вельмі хацелі дзяцей. Але трайняты — нечаканы падарунак, — прызнаецца шматдзетны тата. — На першым УГД сказалі, што будуць двайняты. Праз тыдзень — што трайняты. Памятаю, прыгразіў: «Таццяна, больш на УГД не пойдзем!» *(смяецца)*.

Міліцыянер згадвае, што пра падарунак лёсу спачатку расказалі толькі самым блізкім, каб не сурочыць. Аб тым, што не справяцца, нават і думкі не было. І не такія задачы вырашалі! На курсы для будучых бацькоў не хадзілі: не было вольнага часу. Ды, калі шчыра, вопыт было ў каго пераняць — бабулі і дзядулі заўсёды на падхваце.

— Я адразу сказаў жонцы: «Ты хацела дачку — ты яе называеш, я хацеў сына — імя яму даю я. Наконт трэцяга можам паспрачацца». За пяць хвілін мы назвалі траіх дзяцей, — дзеліцца Андрэй Міхайлавіч.

Мужчына прызнаецца, што са з'яўленнем малых жыццё змяняецца кардынальна. Важна хутка перастроіцца. Тады пытанняў, як усё паспець, не ўзнікне.

— Усе дзеці вельмі розныя! Рома спакойны і добры — апошняе аддасць, калі папросіш. Арцём з Вікай — шустрыя, баявыя. Арцём старэйшы, адчувае гэта і паводзіць сябе як галоўны. Калі іх траіх паставіць побач — атрымаецца лесвіца, — ганарыцца тата. — У нас была падвойная каляска для хлопчыкаў, асобная — для Вікі. Каталася, як каралева *(усміхаецца)!* — Яна татава дачка, заўсёды са мной. Нават коскі заплесці давярае! У мяне, зразумела, атрымліваецца горш, чым у мамы, але я рэгулярна практыкуюся.

Андрэй Міхайлавіч кажа, што ў іх з жонкай розныя падыходы ў выхаванні малых:

— Матуля вельмі далікатная, адказная. Я адношуся да ўсяго прасцей. Лічу, што і той, і другі падыходы — правільныя. Яны паказваюць, што і на жыццё можна глядзець пад рознымі вугламі. Усякае бывае. Але галоўны інструмент выхавання — гэта, бясспрэчна, любоў.

Усе развівальныя практыкаванні з дзецьмі бацькі выконваюць на выхадных. Займаюцца з кожным паасобку, каб адно ў аднаго не падглядалі. У вольны час сям'я Абрамовічаў ходзіць у парк, любіць адпачываць на прыродзе:

— Нядаўна ездзілі з Раманам на рыбалку. У яго ёсць свая вуда, нават чарвякоў сам капае! Сыну падабаецца рыбачыць, ён атрымлівае задавальненне ад самога працэсу.

Андрэй Міхайлавіч нядрэнна гатуе. Любімае блюда — плоў.

— З лёгкасцю звару любы суп, — здзіўляе. — У нас ёсць хатнія нарыхтоўкі ў слоіках. Так мы эканомім час, які сёння на вагу золата.

Маёр кажа, што дзецям падабаецца яго прафесія.

— Просяць, каб я ўзяў іх з сабой на работу, паказаў зброю. Хлопчыкі любяць прымяраць фуражку. Вядома, малым яшчэ рана думаць пра будучую прафесію, спачатку хай у школу пойдуць *(смяецца)*. Мая задача як бацькі — выхаваць дзяцей добрымі людзьмі. Усё астатняе — у іх руках.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.
Фота з архіва героя.

Калонка добрых спраў

Неабыякавасць на дарозе

Нядаўна 21-гадовая жыхарка Мінска вырашыла адправіцца ў аўтападарожжа па Беларусі. З сабой яна ўзяла дзвюх сясцёр і брата. І вось на ажыўленай трасе Мінск — Гродна ў аўтамабіля раптоўна лопнула кола...

Побач праязджаў нарад ДАІ. Міліцыянеры спыніліся, каб высветліць, у чым прычына стаянкі. Адзін з іх вырашыў дапамагчы памяняць кола, якое лопнула, на запасное, але тое было здзьмутае. Выйсце было знойдзена. Інспектар пазычыў помпу ў аднаго з кіроўцаў, які праязджаў па трасе. Машына здолела дабрацца да бліжэйшай станцыі тэхнічнага абслугоўвання. Там і адрамантавалі злашчаснае кола.

Дзяўчына напісала падзяку на сайт Міністэрства ўнутраных спраў. Нераўнадушным міліцыянерам аказаўся інспектар ДПС аддзялення ДАІ Валожынскага РУУС лейтэнант міліцыі Дзмітрый Жалтко.

Таксама адзначыўся яшчэ адзін інспектар таго ж самага аддзялення, капітан міліцыі Павел Жабко. Ён даставіў у бальніцу кіроўцу з Гродна, які адчуў сябе блага за рулём. Урачы аказалі вадзіцелю першую дапамогу. Пераканаўшыся, што яму стала лепш, афіцэр адвёз яго назад да аўтамабіля. Кіроўца ў даўгу не застаўся і падзякаваў інспектару за добрае стаўленне да чужой бяды.

Вось такія асілкі!

Стары малапавярховы жыллёвы фонд, як правіла, не абсталяваны ліфтамі. Гэты недахоп пачынае моцна адчувацца, калі трэба перамясціць нейкі важкі груз. А што рабіць, калі трэба вынесці чалавека?

З такой праблемай сутыкнулася фельчар падстанцыі хуткай медыцынскай дапамогі Людміла Тарасевіч. Медыкі прыехалі на выклік да жыхара аднаго з пяціпавярховікаў. Пажылога чалавека трэба было шпіталізаваць. Але вось тут і атрымалася неспадзяванка: мажны пацыент не мог перамяшчацца без дапамогі. Як жа пранесці яго праз лесвічную клетку?

Фельчар вырашыла папрасіць дапамогі ў мінакоў. Яна выбегла на вуліцу і ўбачыла міліцыянераў, якія стаялі на прыпынку грамадскага транспарту. Гэта былі прапаршчык міліцыі Мікалай Мініч і старшы сяржант міліцыі Арцём Курац, якія служаць у мясцовым аддзеле Дэпартамента аховы. Яны тут жа адгукнуліся і дапамаглі занесці мужчыну ў аўтамабіль хуткай дапамогі. Пасля жанчына пазваніла на тэлефон даверу Міністэрства ўнутраных спраў і падзякавала ім за неабыякавасць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Спорт яднае

У Мінску на спартыўнай пляцоўцы на Цнянскім вадасховішчы прайшоў гарадскі турнір па пляжным валейболе. Яго ўдзельнікі — хлопчыкі і дзяўчынкі, з якімі міліцыянеры праводзяць індывідуальную прафілактычную работу. Рэгламент турніра ўключаў дзевяць камандаў — па адной з кожнага раёна сталіцы. У іх склад уваходзілі не толькі падлеткі, але і інспектары па справах непаўналетніх. У якасці рэферы выступалі суддзі з фізкультурна-аздараўляльнага цэнтра Савецкага раёна. Турнір праводзіўся ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з Мінскай гарадской арганізацыяй БРСМ.

Спаборніцтвы адбываліся па алімпійскай сістэме — гэта значыць, каманда, якая прайграла, тут жа выбывала. На жаль, гульню сапсаваў моцны дождж, які раптоўна наляцеў. Але арганізатары тут жа дамовіліся наконт таго, што турнір будзе завершаны ў спартыўнай зале адной са школ, размешчаных побач.

— Гэтыя мерапрыемствы прымеркаваны да агульнарэспубліканскай міжведамаснай праграмы «Клопат», — расказаў **намеснік начальніка аддзела прафілактыкі ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама Яўген АБРАМОВІЧ.** — Яна мае мэтай заняць падлеткаў улетку карыснымі справамі і не дапусціць таго, каб яны парушалі закон і рызыкавалі сваім жыццём і здароўем. Каманды сфарміраваны так, што ў кожную абавязкова ўваходзяць не толькі дзеці, але і адзін інспектар па справах непаўналетніх. Такім чынам яны збліжаюцца ў нефармальнай абстаноўцы, каб падлетак убачыў у міліцыянеры чалавека, які можа прыйсці на дапамогу.

Раённыя каманды спаборнічаюць адна з адной у розных відах спорту. Гэта не толькі пляжны валейбол, але і футбол, і настольны тэніс, і лазертаг, і стральба з пнеўматычнай вінтоўкі.

Тройку прызёраў турніру па пляжным валейболе ўзначаліў Савецкі раён. Прадстаўнікі Фрунзенскага і Цэнтральнага занялі другое і трэцяе месцы адпаведна. Усе яны атрымалі граматы, медалі і сувеніры.

Валяр'ян ШКЛЕННІК, фота аўтара.

Жыллёвая палітыка

Будаваць жылля будзем больш

Ужо налета спецыялісты плануюць павялічыць агульны аб'ём уводу жылля адразу на 100 тысяч квадратных метраў

Сёлета ў нашай краіне запланавана пабудаваць 4 мільёны квадратных метраў жылля, з іх 984,13 тысячы «квадратаў» з дзяржпадтрымкай. Паводле аператыўных звестак, за студзень—чэрвень у краіне было ўведзена ў эксплуатацыю 1 мільён 774,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, што складае 44,4 % ад гадавога плана. Прычым 515,3 тысячы «квадратаў» пабудавана для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з дзяржпадтрымкай. Гэтыя лічбы агучыў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр АЎРАМЕНКА.

Фота БелТА.

Навасёлы, шматдзетная сям'я Сяргея і Іны ЛЫСКІНЫХ з дзецьмі Дашай і Глебам. Пасёлак Юбілейны Гомельскага раёна.

Акрамя таго, паводле яго інфармацыі, аб'ём будаўніцтва жылля ў нашай краіне плануецца паэтапна павышаць. Эксперты ўпэўненыя, што яго атрымаецца павялічыць да 4,1 мільёна квадратных метраў.

«На наступную пяцігодку, гэта значыць на 2021—2025 гады, мы намецілі павелічэнне гэтых планаў, таму што яшчэ шмат нашых грамадзян не маюць уласнага жылля і гэтую праблему трэба вырашаць. Для гэтага ёсць усе магчымасці ў будаўнічых арганізацый, таксама падрыхтаваныя ўмовы, каб фінансава іх падмацаваць», — падкрэсліў начальнік упраўлення. Аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва на кожны год яшчэ будуць удакладняцца, але будаўнічы комплекс краіны да гэтай работы ўжо рыхтуецца.

Таксама начальнік упраўлення паведаміў, што сярэдняя цана квадратнага метра жылых дамоў, уведзеных у эксплуатацыю за кошт усіх крыніц фінансавання, за студзень—чэрвень бягучага года, па звестках статыстыкі, склаў 1123 рублі, а з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 1019 рублёў.

«Арэнду» вырашылі падвоіць

Што датычыцца развіцця рынку арэнднага жылля, то на бягучы год запланавана пабудаваць 135 тысяч квадратных метраў, і гэта будзе зроблена, запэўніў нас начальнік упраўлення. «З улікам таго, што ад усяго наяўнага ў краіне жылфонду арэндны фонд складае 3,4 %, 135 тысяч «квадратаў» — гэта, безумоўна, мала, тым больш што попыт на тыя кватэры вялікі. Напрыклад, у сталіцы на адну кватэру бывае па 150—200 ахвотных, таму менавіта гэтаму кірунку будзе ўдзяляцца вялікая ўвага. Ужо налета мы плануем пабудаваць прыкладна ў два разы больш, чым сёлета, гэта значыць 270 тысяч квадратных метраў», — адзначыў Аляксандр Аўраменка.

Таксама ён падкрэсліў, што калі ў наступным годзе будзе атрымлівацца пабудаваць больш арэнднага жылля, чым намечана ў планах, то будаўнічы комплекс краіны прыкладзе для гэтага максімум намаганняў. «Гэта залежыць не толькі ад нашага жадання, але, вядома ж, і ад фінансавання. І тут зноў жа будзе ўдзяляцца ўвага таму, каб будаўніцтва арэнднага жылля ажыццяўлялася не толькі за кошт бюджэтных сродкаў, як у асноўным рабілася да гэтага часу, але і за кошт сродкаў прадпрыемстваў розных формаў уласнасці. Заканадаўчая база для гэтага ўжо створана. Каб ахвотных будаваць такое жыллё было больш, цяпер у міністэрстве сумесна з калегамі з іншых ведамстваў прапрацоўваецца пытанне па стварэнні дадатковых ільгот такім прадпрыемствам», — расказаў ён.

Электрадачы — па тым жа графіку

Улічваючы запланаваны на бягучую пяцігодку ўвод у эксплуатацыю Беларускай АЭС, ужо пачынаючы з 2018 года ў краіне будуюцца шматкватэрныя жылыя дамы, у якіх электрычная энергія выкарыстоўваецца для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы. Пакуль такіх эксперыментальных дамоў пабудаваны літаральна адзінкі, але...

Колькасць электрадамоў таксама плануецца паступова павялічыць. Ужо сёлета, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў, запланавана ўвесці ў эксплуатацыю 135 тысяч квадратных метраў такога жылля. На наступны год мяркуецца вызначыць заданне на будаўніцтва ў аб'ёме не менш за 270 тысяч «квадратаў».

«Сёння наша міністэрства цесна працуе з аблвыканкамамі, Мінскім гарвыканкамам і Мінэнерга па адпрацоўцы схем падключэння такіх дамоў. Бо для таго, каб планаваць будаўніцтва падобнага жылля, трэба падрыхтаваць неабходную інфраструктуру, тобок пракласці кабелі, пабудаваць трансфарматарныя падстанцыі і іншае. Гэта патрабуе дадатковага планавання і ўкладання пэўных грашовых сродкаў», — адзначыў Аляксандр Аўраменка.

З улікам сур'ёзных планаў па будаўніцтве электрадамоў на 2021—2025 гады пастаўлена задача сумесна з Мінэнерга вызначыцца па кожным аб'екце для магчымасці своечасовага праектавання магістральных сетак і іншага інжынернага абсталявання.

Шматдзетныя ў жыллёвай чарзе — не больш за год

Начальнік аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Іна ПІНКОЎСКАЯ, у сваю чаргу, адзначыла, што дзяржава аказвае грамадзянам комплексную падтрымку ў фінансаванні жыллёвага будаўніцтва. У асноўным гэта актуальна для шматдзетных сем'яў.

«Перад намі стаіць задача, каб з наступнага года шматдзетная сям'я знаходзілася ў чарзе на жыллё не больш за год. У невялікіх райцэнтрах гэты гадавы тэрмін у асноўным выконваецца, там шматдзетныя сем'і даволі хутка накіроўваюцца на будаўніцтва жылля. Праблема існуе ў буйных раённых, абласных цэнтрах і Мінску. Але тэмпы будаўніцтва жылля для гэтай катэгорыі грамадзян павялічаны, як і тэмпы накіраванняў на будаўніцтва жылля», — паведаміла яна.

Іна Пінкоўская нагадала, што з пачатку гэтага года шматдзетным сем'ям дазволена датэрмінова выкарыстоўваць сродкі сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Гэта велізарная дапамога. Да таго ж дзяржаўная дапамога будзе павялічвацца, заканадаўства ў гэтым плане ўдасканальваецца, сёння дадаткова разглядаюцца магчымасці падтрымкі шматдзетных сем'яў.

Аднак у буйных гарадах нават шматдзетныя затрымліваюцца ў чэргах па некалькі гадоў. **Намеснік начальніка аддзела прававога рэгулявання і рэалізацыі жыллёвай палітыкі ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Алена РАДЗЬКО** паведаміла, што цяпер на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Мінску знаходзіцца больш за 192 тысячы сем'яў, з іх 6283 — шматдзетныя, прычым з гэтых шматдзетных 3456 яшчэ не накіравана на будаўніцтва жылля, а звыш 890 сем'яў стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу, больш за тры гады. У спісе шматдзетных сем'яў, якія прэтэндуюць на зямельны ўчастак, зараз больш за 800 сем'яў.

Для шматдзетных у Мінску будуюць адразу 23 шматпавярхоўкі

Як адзначыў **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Дзяніс НІКІЦІН,** цяпер у сталіцы ў стадыі будаўніцтва знаходзяцца 140 жылых дамоў агульнай плошчай 1,6 мільёна квадратных метраў. З іх 500 тысяч «квадратаў» будуюць камунальныя забудоўшчыкі, 1,1 мільёна — камерцыйныя прадпрыемствы.

Найбольш маштабнае будаўніцтва жылля вядзецца ў Кастрычніцкім раёне, дзе ўзводзіцца каля 700 тысяч квадратных метраў жылля, што складае больш за 40 % ад усяго аб'ёму жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы. У тройку лідараў таксама ўваходзяць Цэнтральны і Маскоўскі раёны, дзе ўзводзіцца 245 тысяч і 219 тысяч квадратных метраў жылля адпаведна. Па выніках года ў Мінску плануецца выканаць заданне, даведзенае ўрадам, па будаўніцтве 630 тысяч квадратных метраў жылля.

«У Мінску прыярытэтным у жыллёвым будаўніцтве з'яўляецца накіраванне грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на будаўніцтва жылля. У першую чаргу гэта шматдзетныя сем'і. Сёння для названых катэгорый грамадзян у стадыі будаўніцтва знаходзіцца 23 шматкватэрныя жылыя дамы, а гэта больш за тры тысячы кватэр. Да канца года запланавана будаўніцтва яшчэ 27 шматкватэрных жылых дамоў», — паведаміў Дзяніс Нікіцін. Асноўныя будаўнічыя пляцоўкі для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзяцца ў мікрараёнах Лошыца, Чыжоўка і яшчэ некаторых. У Мінску таксама вызначаны зямельныя ўчасткі для будаўніцтва індывідуальных дамоў. Размешчаны яны будуць у мікрараёнах Сокал, Чыжоўка, вёсцы Зацань, а таксама на тэрыторыі паміж вуліцамі Ангарскай і Байкальскай.

Сяргей КУРКАЧ.

Новыя будматэрыялы і тэхналогіі ўзаконяць дакументальна

Сёлета прымуць 22 будаўнічыя нормы, а на стадыі распрацоўкі яшчэ 28 правіл

Пра гэта паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення горада-будаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Вольга ВЕРАМЕЙ.

Паводле інфармацыі начальніка ўпраўлення, пастановамі Мінбудархітэктуры зацверджаны 32 будаўнічыя нормы. Гэтыя дакументы апублікаваныя на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Таксама пастановамі ведамства зацверджаны чатыры будаўнічыя правілы, азнаёміцца з якімі можна бясплатна ў чытальнай зале Нацыянальнага фонду тэхнічных нарматыўных прававых актаў, чытальнай зале РУП «Будтэхнорм» і на сайце www.tnpa.by.

Дырэктар РУП «Будтэхнорм» Ігар ЛІШАЙ адзначыў, што мэта прыняцця новых будаўнічых нормаў — не проста змяненне статусу дакументаў, а кардынальны перагляд усіх нормаў. «Сёння многія прагрэсіўныя тэхналогіі, новыя будматэрыялы і архітэктурныя падыходы цяжка выкарыстаць, таму што менавіта гэтага тэхнічнага рашэння не было ў нормах, якія дасталіся нам з часоў Савецкага Саюза. Трэба даць магчымасць архітэктарскай задуме, новым будматэрыялам і тэхналогіям знайсці сваё адлюстраванне ў будаўніцтве і праектаванні», — заявіў кіраўнік прадпрыемства.

Характэрна, што сярод новых нормаў, якія ўжо ўзгодненыя Міжведамасным саветам і знаходзяцца на стадыі зацвярджэння Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва, досыць шмат дакументаў, якія зацікавяць нават простых грамадзян.

Адзін з іх — будаўнічыя нормы, якія датычацца забеспячэння тэхнічнай абароненасці будынкаў. Гэта досыць спецыфічны дакумент. Ён накіраваны на аб'екты грамадскага прызначэння, на якіх магчыма масавае збіранне людзей. Нормы прадугледжваюць забеспячэнне тэхнічнай абароненасці і датычацца абсталявання будынкаў і збудаванняў сістэмамі відэаназірання, металашукальнікамі, а таксама арганізацыі пэўных уваходаў і выхадаў для эвакуацыі людзей пры надзвычайных сітуацыях. У найбліжэйшы час гэтая норма будзе зацверджана.

Другая значная норма датычыцца абароны ад шуму. Дакумент канкрэтызуе патрабаванні да ўдарнага шуму і абароненасці памяшканняў ад шумавога фону з вуліцы. Важнымі таксама, на думку эксперта, з'яўляюцца новыя будаўнічыя нормы, якія датычацца энергетычнай эфектыўнасці будынкаў і збудаванняў. «Сёння рэсурсы досыць дарагія, і задача эканоміць усе віды энергіі стаіць вельмі масава. Дакумент устанаўлівае пэўныя патрабаванні да энергаэфектыўных будынкаў, вызначае іх класіфікацыю. Гэта маштабны і патрэбны дакумент, які ў Беларусі распрацаваны ўпершыню», — паведаміў дырэктар.

Сяргей ПАЛІНІН.

«Паставіць елку макаўкай уніз і здзіўляцца, што яна ўвесь час падае»

Што не так з беларускімі аб'яднаннямі ўласнікаў жылля

Можна сказаць, што ў Беларусі сфера кіравання жылля толькі пачынае развівацца, і на сёння ў краіне існуе некалькі спосабаў кіравання шматкватэрнымі жылымі дамамі. Эксперт — выканаўчы дырэктар Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці Генадзь КАЛЁНАЎ расказвае, у чым плюсы і мінусы такой сістэмы і ў якім кірунку трэба рухацца Беларусі, каб дасягнуць поспехаў у гэтай сферы.

— Генадзь Генадзевіч, многія ўласнікі лічаць, што ўсё, што знаходзіцца за межамі кватэры, іх не датычыцца. Ці правільна гэта?

— Абавязак утрымліваць агульную маёмасць ёсць ва ўсіх удзельнікаў сумеснага домаўладання, у тым ліку і ўласнікаў нежылых памяшканняў — у гэтым сэнсе ўсе роўныя. Агульная маёмасць — гэта тое, што з'яўляецца асновай кожнага шматкватэрнага дома, і без яе нават немагчыма існаванне кватэр. Агульная маёмасць складае ад 90 да 95 % кошту ўсяго дома. Калі ўласнік набывае кватэру, то ён становіцца саўладальнікам усяго шматкватэрнага жылога дома, яму належыць віртуальная частка агульнай маёмасці, роўная долі плошчы яго кватэры ў агульнай плошчы ўсіх жылых і нежылых памяшканняў. Гэтую долю вылічваюць, каб размяркоўваць расходы на ўтрыманне агульнай маёмасці — сцен, даху, перакрыццяў, ліфтоў, інжынернага абсталявання і шмат чаго іншага.

— Як у Беларусі кіруюць агульнай маёмасцю?

— У нашай краіне ўсе шматкватэрныя жылыя дамы, за выключэннем арэндных дамоў мясцовых органаў улады, з'яўляюцца сумеснымі домаўладаннямі, і заканадаўца ўстанавіў тры спосабы кіравання імі — непасрэдны (калі імі кіруюць самі ўласнікі — звычайна ў невялікіх шматкватэрных дамах), праз стварэнне арганізацыі ўласнікаў (некамерцыйнай юрыдычнай асобы), а калі ўласнікі не выбралі спосаб кіравання домам, то агульнай маёмасцю дома кіруе дзяржаўная арганізацыя, якую вызначае мясцовая ўлада (так званая служба заказчыка, у Мінску — КУП «ЖКГ»). Арганізацыі ўласнікаў — таварыствы ўласнікаў і жыллёва-будаўнічыя спажывецкія кааператывы — можна стварыць для кіравання агульнай маёмасцю яшчэ да таго, як дом увялі ў эксплуатацыю. Што ж датычыцца шматкватэрных дамоў старой пабудовы, то там таварыства ўласнікаў можна стварыць па ініцыятыве болей чым 2/3 жыхароў. У любых іншых выпадках мясцовая ўлада назначае знешняе кіраўніцтва.

— І ў чым яно заключаецца?

— Служба заказчыка мае права толькі кіраваць — заключаць ад імя ўласнікаў дагаворы на аказанне паслуг на канкурэнтнай аснове, арганізоўваць праз працэдуру дзяржаўнай закупкі бягучы і капітальны рамонт дома, яго мадэрнізацыю, кантраляваць аб'ём і якасць выкананых работ. Паслугу па кіраванні маёмасцю аказваюць на аснове дагавора з кожным уласнікам памяшкання, і з ліпеня наступнага года яна будзе вылучана ў асобную ў паведамленні аб аплаце. На цяперашні момант яе кошт размеркаваны сярод іншых жыллёва-камунальных паслуг.

— А чым дзяржаўная кампанія адрозніваецца ад таго ж таварыства ўласнікаў?

— У таварыствах уласнікаў часта гучыць такая фраза: «Калі не знойдзем старшыню праўлення, то пойдзем у ЖЭУ». І вось гэта няправільна і бессэнсоўна, гэта рэха дзевяностых гадоў. ЖЭУ — гэта падрадная арганізацыя, якая аказвае сэрвісныя паслугі, і не мае ніякага дачынення да шматкватэрнага дома ці кіраванне ім. Заключыць дагавор можа як таварыства ўласнікаў, так і служба заказчыка. Аднак таварыству для гэтага дастаткова працэдуры перагавораў, а служба заказчыка павінна правесці працэдуру дзяржаўнай закупкі паслуг для дома. Таварыства мае права самастойна аказваць паслугі, а служба заказчыка — не, бо з'яўляецца толькі кіруючай дзяржаўнай кампаніяй. Пры гэтым тэндар на аказанне паслуг можа выйграць арганізацыя любой формы ўласнасці, і ў Мінску гэта здараецца ўсё часцей. Таму перавага такой сістэмы — дакладнае размеркаванне на кіраўніцтва і сэрвіс, прызнанне кіраўніцтва галоўным відам дзейнасці, аказанне паслуг толькі на канкурэнтнай аснове і кантроль за іх выкананнем, магчымасць для грамадзян у любы час прыняць рашэнне аб стварэнні арганізацыі ўласнікаў для самакіравання.

— Але ж пэўныя недахопы існуюць?

— Галоўны недахоп службаў заказчыка заключаецца ў тым, што яны назначаюцца мясцовай уладай (а ў перспектыве іх павінны выбіраць уласнікі на канкурэнтнай аснове) і маюць тэрытарыяльны прынцып дзейнасці. Гэта значыць, што калі сям'я жыве ў Першамайскім раёне Мінска, то кіраваць іх домам можа толькі КУП «ЖКГ Першамайскага раёна», выбару ў іх няма. Што ж датычыцца таварыстваў і ЖБСК, то яны патрабуюць дадатковых расходаў на іх утрыманне як юрыдычных асоб. У паспяховых краінах свету такія аб'яднанні з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі з частковай правамоцнасцю, не маюць штатных супрацоўнікаў і дадатковых расходаў. Акрамя таго, у нас вельмі цяжкая працэдура змены кіраўніка таварыства, і бывае, што працэс зацягваецца нават на гады. Больш за тое, адсутнічае сістэма навучання тых кіраўнікоў — у нас гэта проста павышэнне кваліфікацыі на працягу трох дзён, а павінна быць навучанне па спецыяльнасці ў прафтэхвучылішчы, каледжы ці ВНУ.

— Ці не прасцей тады стварыць нейкую адзіную юрыдычную асобу, якая будзе кіраваць шматкватэрнымі дамамі?

— Такога не толькі нельга рабіць у рамках нашага заканадаўства, але і не патрабуецца. Гэта ўсё роўна што зрабіць ЦУМ адзіным пунктам продажу пральнага парашку для ўсёй краіны. Наадварот, трэба стварыць больш магчымасцяў, якія будуць прадугледжваць выбар на канкурэнтнай аснове. Гэта можа быць стварэнне заканадаўчых умоў для прафесійнага кіравання нерухомасцю, такіх як у Аўстрыі ці Швейцарыі, напрыклад. **Наогул, галоўнае ў кіраванні жыллём — прафесійны кіраўнік, інфармаваны ўласнік і давер паміж імі. І толькі пры гэтых умовах сістэма кіравання жыллём будзе адпавядаць Мэтам устойлівага развіцця ААН.**

— А што наконт правіл — ці павінны яны быць?

— Так, для належнага кіравання агульнай маёмасцю ў мэтах грамадзянскай бяспекі і для захавання правоў спажыўцоў. Калі чалавек набывае кватэру, ён павінен загадзя ведаць спажывецкія якасці дома, што можна і што нельга там рабіць, за што неабходна плаціць, ведаць працэдуру прыняцця рашэнняў. **Калі пасля засялення ў шматкватэрны дом уласнікі пачынаюць зносіць перагародкі, мяняць інжынерныя камунікацыі, сварыцца і спрачацца на агульных сходах, каб устанавіць пэўныя правілы, — гэта не самакіраванне, гэта варварства, якому няма месца ў «зялёнай» эканоміцы стагоддзя.**

— Ці можна тут узяць на ўзбраенне замежны вопыт?

— У паспяховых краінах свету, у тым ліку і ў Кітаі, правілы і адказнасць будучых уласнікаў фарміруюцца яшчэ на этапе праектавання і будаўніцтва шматкватэрнага дома. Калі чалавек набывае кватэру там, ён натарыяльна запэўнівае, што правілы канкрэтнага дома і ўмовы аплаты паслуг яму вядомы і ён будзе іх выконваць. Аб'яднанні ўласнікаў як юрыдычныя асобы з частковай правамоцнасцю ствараюцца ва ўсіх шматкватэрных дамах — сумесных домаўладаннях. У банку адкрываюць два рахункі на імя аб'яднання, адзін з іх з'яўляецца бягучым, другі — назапашвальным. Для кіравання агульнай маёмасцю і рахункамі на канкурэнтнай аснове прыцягваюць прафесійных кіраўнікоў. Часцей за ўсё гэта юрыдычныя асобы, прыватныя ці муніцыпальныя, радзей — фізічныя асобы, такія як індывідуальныя прадпрымальнікі. Прыблізна 95 % менеджараў у такіх кампаніях ці ІП праходзяць навучанне ў спецыялізаваных тэхнікумах і каледжах і толькі 5 % — у ВНУ. Больш за тое, кожны год усе яны павінны павышаць сваю кваліфікацыю на працягу 20-30 вучэбных гадзін.

— І якім чынам адбываецца найм такіх менеджараў?

— Як мінімум трох запрашаюць на агульны сход членаў аб'яднання ўласнікаў, дзе яны прадстаўляюць свае кампаніі. Далей ідзе тайнае галасаванне, і агульны сход даручае старшыні савета дома, які дзейнічае на грамадскіх пачатках, заключыць дагавор кіравання з пэўнай кампаніяй на пяць гадоў. Далей усю работу — пошук сэрвісных кампаній, кантроль, арганізацыю агульных сходаў, пратакаліраванне, вядзенне «Справы дома» ў электронным выглядзе, падрыхтоўку справаздач і планаў па рамонце — выконвае менеджар кампаніі і нясе за гэта адказнасць. Толькі пералік абавязкаў менеджара, як правіла, складае 2-3 старонкі ў дагаворы, і пералічыць сцісла асаблівасці гэтай прафесіі немагчыма.

— У краінах СНД не так?

— У тых жа Аўстрыі, Германіі ці Швецыі галоўнае — шматкватэрны дом, кватэры ж адыходзяць на другі план. Менавіта таму спачатку даюцца правілы, у тым ліку па кіраванні агульнай маёмасцю і страхаванні ўсяго дома ад пажараў і стыхійных бедстваў, і толькі потым адбываецца засяленне. **У краінах СНД усё наадварот. Тут галоўнымі з'яўляюцца кватэры і іх уласнікі, вакол якіх, як вакол цэнтра галактыкі, павінны круціцца падрадчыкі, агульная маёмасць, кіраўнікі сэрвісных кампаній і чыноўнікі, якія адказваюць на скаргу. Гэта як паставіць елку макаўкай уніз і здзіўляцца, што яна ўвесь час падае.**

— І менавіта вырашэнне гэтага пытання ў кампетэнцыі дзяржавы?

— Роля дзяржавы вельмі вялікая, краіны СНД і некаторыя краіны ЕС, якія вырашылі самаўхіліцца, ужо аб гэтым пашкадавалі. Дзяржава не павінна дапускаць, каб жылы фонд руйнаваўся і прыходзіў у аварыйны стан. Пры гэтым яна павінна не ўмешвацца ў жыццё кожнага аб'яднання ўласнікаў, а загадзя ўстанаўліваць вядомыя і зразумелыя правілы для іх. **Неабходна стварыць умовы, простыя і лаканічныя правілы, пачынаючы з праектавання дома і да яго ўтылізацыі, якія будуць заснаваны на парадку і грамадскай бяспецы. Звычайна, калі казаць пра паспяховыя краіны, канструктыўны дыялог наконт такіх правіл з уладамі вядуць не палітыкі, а прафесійныя суполкі, якія дэталёва валодаюць пытаннем.**

Да 2025 года насельніцтва забяспечаць якаснай пітной вадой

Да 2025 года Мінск павінны цалкам забяспечыць пітной вадой з падземных крыніц. Пра гэта на пасяджэнні калегіі Міністэрства ЖКГ паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што сталіцы неабходна дадаткова арганізаваць для горада дастаўку каля 180 тысяч кубаметраў вады кожны дзень. На сёння распрацаваны праграмы, ідзе работа над перадпраектнай дакументацыяй, каб забяспечыць увесь Мінск пітной вадой з падземных крыніц да 2025 года.

Каб якасную пітную ваду мела ўся краіна, да 2025 года трэба пабудаваць яшчэ 1385 станцый абезжалезвання. Па інфармацыі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у рамках Дзяржпраграмы «Чыстая вада» з 2016 года ў краіне было пабудавана 439 станцый абезжалезвання, амаль па 300 аб'ектаў плануюць запусціць сёлета і налета.

* * *

Што ж датычыцца рамонту жылога фонду, то ў рамках Дырэктывы № 7 сёлета неабходна адрамантаваць амаль чатыры мільёны квадратных метраў жылля.

Праз тое, што ад плана адстаюць Гомельшчына і Мінск, выніковая лічба па краіне склала 73 % ад гадавога задання, — адзначыла **начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства ЖКГ Ала РАМАНЬКОВА.** — Станоўчую дынаміку можна адзначыць у рабоце па замене ліфтоў — няглядзечы на тое што Гомельшчына не дасягнула паўгадавога задання, наогул па Беларусі камунальнікі выканалі паўгадавы план больш чым на 130 %.

Перавыкананы план і па замене цеплавых сетак — за паўгода камунальнікі замянілі больш за 250 кіламетраў, што складае 113 % ад задання. Крыху адсталі толькі гродзенскія прадпрыемствы ЖКГ — яны выканалі план на 70 %.

* * *

Па інфармацыі Міністэрства ЖКГ, добрых паказчыкаў удалося дасягнуць і ў мерапрыемствах па паніжэнні затрат — за паўгода камунальнікі паменшылі іх на 6,1 %, у той час як заданне складала толькі 5 %. Асаблівую ўвагу на калегіі ўдзялілі і фінансавай дысцыпліне. На сёння мясцовыя органы ўлады павінны камунальнікам ужо больш за 10 мільёнаў рублёў, 65 мільёнаў прадпрыемствы ЖКГ недаатрымалі за правядзенне работ па добраўпарадкаванні.

Шмат фінансаў, як і раней, аднімаюць непрофільныя аб'екты — за гэтыя паўгода іх колькасць павялічылася на 41. Пры гэтым амаль па 700 аб'ектах на 1 ліпеня камунальнікам не вярнулі грошы ў поўным аб'ёме, і па гэтым кірунку ім вінныя больш за 700 тысяч рублёў.

* * *

Што да збору другасных матэрыяльных рэсурсаў, то за першае паўгоддзе заданне выканана амаль на 50 % — за гэты час сабралі звыш 400 тысяч тон ДМР. Пры гэтым калі параўноўваць з мінулым годам, то сёлета наблюдаецца рост па ўсіх відах ДМР, акрамя шкла.

— У гэтым годзе мы плануем запусціць тры буйныя аб'екты — ужо на 85 % гатовы смецце-сартавальны завод у Віцебску і выконваюцца будаўніча-мантажныя работы на ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» па выкарыстанні RDF-паліва, — адзначыла **дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ.**

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя КІСЛАЯ.

На кантролі

Арыенцір на бяспеку

Спажывецкі рынак: кантроль і ўдасканаленне

За першае паўгоддзе бягучага года было канфіскавана з абароту каля 1,5 тысячы найменняў прадукцыі, якая не адпавядае патрабаванням. Пра гэта расказаў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Дзмітрый БАРТАШЭВІЧ.

— Забаронены ўвоз 900 найменняў небяспечнай прадукцыі, спынена дзеянне больш чым 600 дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці. У ліку найбольш распаўсюджаных парушэнняў — паказчык бяспекі тавару, ён склаў 36 працэнтаў; недакладная або няпоўная інфармацыя для спажыўцоў — 32 працэнты; адсутнасць дакументаў на пацвярджэнне адпаведнасці — 27 працэнтаў. У пералік забароненай і небяспечнай прадукцыі трапілі розныя віды электрапрыбораў, лямпы, гірлянды, цацкі, мэбля, харчовая прадукцыя, тавары лёгкай прамысловасці.

Усяго ў рэестры ўтрымліваецца каля 2,8 тысячы найменняў тавараў, забароненых да ўвозу і абарачэння на тэрыторыі краіны. Адмененых дакументаў аб ацэнцы адпаведнасці — больш за 2 тысячы. «Гэта тыя тавары, якія не адпавядалі патрабаванням і ў дачыненні да якіх былі зафіксаваныя грубыя парушэнні патрабаванняў бяспекі. Мы прапануем усім зацікаўленым выкарыстоўваць рэестр ў сваёй рабоце, каб не дапусціць закупкі такой прадукцыі, а таксама паведамляць, калі падобны тавар сустракаецца на рынку. Да таго ж існуе і механізм выключэння з такога спіса. На сёння прынята каля 80 рашэнняў, калі прадукцыя, выключаная з рэестра, змагла зноў паступіць на рынак», — дадаў спецыяліст.

ШТО «ХАВАЕЦЦА Ў АБУТКУ»...

За першае паўгоддзе бягучага года ў Мінску і Мінскай вобласці інспекцыя Дзяржстандарта правярыла больш за тысячу найменняў прадукцыі лёгкай прамысловасці. Неадпаведнасць патрабаванням устаноўлена ў больш чым 90 працэнтаў вырабаў, расказала **начальнік аддзела дзяржаўнага нагляду за тэхнічнымі рэгламентамі і метралагічнага кантролю Дзяржстандарта Вольга МАЖЭЙКА.**

— Больш за ўсё прыпадае на маркіроўку — прыкладна 55 працэнтаў. На якасць і бяспеку — каля 21 працэнта, прычым з іх больш за палову — гэта рэалізацыя прадукцыі са скончаным тэрмінам прыдатнасці ўжывання. Яшчэ амаль 25 працэнтаў — на адсутнасць дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці. Па маркіроўцы выяўляюцца выпадкі поўнай яе адсутнасці або нечытэльная інфармацыя, недакладныя звесткі. Асноўную частку парушэнняў па бяспецы прадуктаў складаюць тыя, што датычацца мікрабіялагічных паказчыкаў, — гэта перавышэнне колькасці мікраарганізмаў, дапушчальнага ўзроўню ўтрымання цвілі і дрожджаў, а таксама сінтэтычных фарбавальнікаў і іншых харчовых дабавак. Акрамя таго, у некаторых таварах былі выяўлены недапушчальныя бактэрыі групы кішэчных палачак, патагенная мікрафлора.

Яшчэ адно распаўсюджанае парушэнне — выкарыстанне пры вытворчасці харчовай прадукцыі маслатлушчавай сыравіны з утрыманнем транс-ізамераў тлустых кіслот, вышэйшым за дапушчальны ўзровень. «Апошнім часам на рынку мы сталі заўважаць, што павялічылася колькасць такой прадукцыі з Украіны (мучныя, кандытарскія вырабы), яна па гэтых паказчыках забараняецца да ўвозу і абарачэння на тэрыторыі нашай краіны. Увогуле больш падрабязную інфармацыю аб парушэннях можна знайсці ў рэестры небяспечнай прадукцыі, які размешчаны на сайце Дзяржстандарта. Кожны можа звярнуцца да гэтага рэсурсу і ўбачыць прадукты, якія варта абыходзіць бокам пры наведванні крам», — звярнула ўвагу Вольга Мажэйка.

тамі і стандартамі ў лёгкай, дрэваапрацоўчай прамысловасці і будаўнічай індустрыі інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і Мінску Людміла КУЗНЯЦОВА.

— Гэта ў асноўным прадукцыя, якая ўвозіцца на тэрыторыю Беларусі з Кітая, Расіі, Турцыі, Узбекістана, Кыргызстана. Катэгорыя ахоплівае такія групы тавараў, як абутак, адзенне, трыкатажныя і швейныя вырабы. Сярод парушэнняў — адсутнасць дакументаў аб пацвярджэнні іх адпаведнасці, невыкананне патрабаванняў бяспекі. А менавіта — у швейных, трыкатажных вырабах для дзяцей былі выяўлены нізкія гіграскапічнасць (здольнасць матэрыялу паглынаць і аддаваць вільгаць) і паветрапранікальнасць матэрыялу. Значэнні ў 6-8 разоў ніжэйшыя за ўстаноўленыя нормы. А гэта вельмі важныя паказчыкі для здароўя і самаадчування дзяцей. У абутку трываласць мацавання дэталяў нізу аказалася ў некалькі разоў меншая за норму, а вышыня абцаса ў дзявочых туфлях, наадварот, была перавышана. У сподняй бялізне для дзяцей ранняга ўзросту (да аднаго года) былі выяўлены парушэнні ў частцы ўжывання недапушчальных сінтэтычных матэрыялаў. У таварах для нованароджаных швы выкананы на сподні бок, што не дапускаецца патрабаваннямі тэхнічных рэгламентаў і таксама ўплывае на камфорт дзяцей. У школьных заплечніках былі выяўлены парушэнні патрабаванняў бяспекі, а таксама адсутнічалі святлоадбівальныя элементы.

Людміла Кузняцова адзначыла, што дагэтуль актуальная праблема з маркіроўкамі тавараў лёгкай прамысловасці. На іх часта адсутнічае інфармацыя пра краіну-вытворца, імпарцёра, найменне і прызначэнне прадукцыі, мадэль, артыкул, матэрыял, з якога выраблена прадукцыя.

ЛІЧБЫ СКАЖУЦЬ БОЛЬШ

Па выніках кантрольна-наглядных мерапрыемстваў, праведзеных інспекцыяй Дзяржстандарта, да рэалізацыі забаронена 1331 партыя прадукцыі лёгкай прамысловасці на суму больш за 250 тысяч рублёў, выдадзены прадпісанні і накіраваны рэкамендацыі ліквідацыі парушэнняў 87 суб'ектам гаспадарання. Складзены і накіраваны на разгляд у суд 140 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Выдадзены прадпісанні аб канфіскацыі 67 найменняў прадукцыі. Забаронены да ўвозу і абарачэння 40 найменняў тавараў, спынена дзеянне 27 дакументаў аб ацэнцы адпаведнасці на адзенне і абутак імпартнай вытворчасці.

Людміла Кузняцова расказала, што асаблівая ўвага ўдзялялася мерапрыемствам у адносінах да суб'ектаў гаспадарання, якія рэалізуюць прадукцыю лёгкай прамысловасці імпартнай вытворчасці па нізкіх цэнах. «У дачыненні да іх праведзена 41 праверка — гэта амаль траціна ўсіх кантрольна-наглядных мерапрыемстваў, якія выконваюцца па прадукцыі лёгкай прамысловасці. Увогуле быў праведзены маніторынг у дачыненні да 603 найменняў такіх вырабаў, з іх 601 не адпавядала патрабаванням. Да рэалізацыі забаронены 592 партыі тавараў, канфіскавана з абарачэння 26 найменняў, складзена 35 пратаколаў, прыпынена работа чатырох гандлёвых аб'ектаў».

БЕЗ ПРАВЕРАК НЕ БУДЗЕ ЯКАСЦІ

Актыўная работа па абароне ўнутранага рынку ад небяспечнай прадукцыі праводзіцца санітарна-эпідэміялагічнай службай па двух кірунках, расказала **загадчыца аддзела гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вія ШУКЕВІЧ.**

— Першы — гэта забеспячэнне санітарна-ахоўных мер супраць завозу ў краіну патэнцыйна небяспечнай прадукцыі. У 36 пунктах пропуску на шляху міжнародных аўтамабільных, паветраных і чыгуначных зносін праводзіўся эпідэміялагічны нагляд. За першае паўгоддзе бягучага года было агледжана каля 110 тысяч партый тавараў аб'ёмам звыш 570 тысяч тон, што ў два разы больш за паказчык аналагічнага перыяду мінулага года. Прыпынены або часова забаронены ўвоз на тэрыторыю ЕАЭС звыш 3,6 тысячы партый тавараў, а гэта больш за 61 тысячу тон. Другі кірунак датычыцца правядзення санітарнага нагляду для абароны ўнутранага рынку ад небяспечнай прадукцыі. За першае паўгоддзе асноўныя парушэнні, якія былі выяўлены, — гэта рэалізацыя тавараў без маркіроўкі або з няпоўнай маркіроўкай, продаж харчовай прадукцыі са скончаным тэрмінам ужывання, без дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку тавару, а таксама парушэнні ўмоў захоўвання. Забаронена рэалізацыя звыш 70 тон прадуктаў, з іх больш чым 26 тон — імпартнай вытворчасці (кандытарскія вырабы, арэхі, сухафрукты, свежамарожаная рыба, спецыі).

Вія Шукевіч адзначыла, што ў структуры небяспечнай нехарчовай прадукцыі ўдзельная вага цацак складае 25 працэнтаў, парфумерыі і касметыкі — 9 працэнтаў, тавараў для дзяцей — 3 працэнты. Усяго забаронена рэалізацыя звыш 41 тысячы тавараў нехарчовай групы. Ужыты меры адміністрацыйнага ўздзеяння, прыпынена выкананне работ і паслуг на 2,5 тысячы аб'ектаў. Выдадзена звыш 10,5 тысячы прадпісанняў і рэкамендацый па ліквідацыі парушэнняў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Ваша права

КАНСУЛЬТАЦЫІ ПРАЗ TELEGRAM ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І БАЦЬКОЎ

Атрымаць карысныя парады і вырашыць непаразуменні, якія ўзнікаюць паміж пакаленнямі, цяпер стала яшчэ прасцей. Пракансультавацца па пытаннях, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы дзіцяці, цяпер можна праз чат-бот у Telegram @kids_lawyer_bot.

Такую магчымасць далі прадстаўнікі Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі разам са спецыялістамі Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў. Па серадах з 16.00 да 18.00 можна абмеркаваць са спецыялістамі пытанні грамадзянскага і сямейнага права. А па пятніцах з 15.00 да 17.00 — разабрацца з акалічнасцямі крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

— Мы ўпэўнены, што ў Беларусі існуе патрэба ў такой дапамозе, і гатовыя разам з адвакатамі прапанаваць яе. Цягам месяца праект мае працаваць у тэставым рэжыме, мы будзем збіраць звароты людзей і рыхтаваць на іх адказы. А ў будучым спадзяёмся зрабіць яго пастаянным, каб падтрымліваць непаўналетніх і іх бацькоў, якім патрэбны кансультацыі па пытаннях юрыдычнай адказнасці і шлюбна-сямейных адносін, — удакладніў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі.**

Нагадаем, што ў краіне працуе яшчэ і бясплатная кругласутачная ананімная дзіцячая тэлефонная лінія 8 801 100 16 11, а таксама анлайн-кансультаванне на сайце http://kids.pomogut.by.

Ірына СІДАРОК.

Жніво-2020

ЯЧМЕННАЯ ГАРАЧАЯ ПАРА

Штодня **камбайнер Сяргей ЯКІМАЎ і яго памочнік Аляксандр ДЗЯЛЁЎ** шчыруюць на палях калгаса «Чарняхоўскі-Агра» Карэліцкага раёна на сваім «Палессі». За два-тры тыдні трэба паспець сабраць з палеткаў увесь хлеб. Гэтымі днямі яны працуюць на ячменным полі. Культура, кажуць, капрызная да вільгаці: толькі раса пачне брацца, ячмень ужо жаць нельга — вельмі хутка ён пачынае сырэць.

— Зранку ўвесь камбайн правяраецца, змазваецца ды чысціцца, і ўжо а палове дзясятай мы ў полі. Ячмень якраз да гэтага часу падсыхае, і яго можна збіраць, — кажа камбайнер. — Колькасць сабранага дзень на дзень не прыходзіцца — усё ад надвор'я залежыць. Але ж падчас уборачнай мы ўвесь пагодны час на полі. Цяжка, але ж прывыкаеш. Дадому прыйдзеш, паспіш — і зноў па новай. Восем гадоў таму я ўжо працаваў на камбайне, дык пасля ўвесь час, дзе б ні ўбачыў яго, — аж душа цягнулася за руль ізноў сесці.

З 21 ліпеня экіпаж намалаціў ужо каля 400 тон. Сяргей Якімаў у раёне прыезджы, працуе ў калгасе з мая гэтага года, але ўжо ўцягнуўся ў работу. З жонкай атрымалі жыллё і перспектывы на будучыню. Сын працуе на збожжасушылцы, дачка з'ехала замуж у Барысаў. Дагэтуль, кажа камбайнер, па гаспадарках усёй краіны паматаўся і на прыватнікаў папрацаваў. Але ж захацелася пэўнай стабільнасці, ды і стаміўся, вось і прыбіўся да сельскагаспадарчага берага.

Аляксандр Дзялёў (малады ды нежанаты) — тутэйшы, нараdзіўся ў аграгарадку Турэц, тут жа і жыве, і працуе — памочнікам камбайнера ўлетку, механікам сельскагаспадарчых машын — у астатні час. Скончыў Жыровіцкі аграрны каледж, завочна паступіў вучыцца ў Баранавічы на інжынера. Хлопец сочыць, летам зарабіць на зборы ягад, у яе змяніліся. Адны людзі падыходзяць да справы адказна, акуратна збіраюць спелыя чарніцы, а іншыя могуць з дапамогай розных прыстасаванняў налупіць зялёных з лісцем, галінкамі, не зважаючы на расліну. А так рабіць нельга, гэта вядзе да спусташэння прыроды. І, вядома, такую ягаду ніхто не прыме, нагадала прыёмшчыца.

— У нас няма дастатковага запасу карысных выкапняў, але ёсць аднаўляльныя рэсурсы, — разважае Валерый Баярын. — Толькі як напаўняецца бункер, ды глядзіць, каб жняярка дзе на якую купіну ці камень не наскочыла. «Гэты ж яравы ячмень, а не азімы, таму тут зямля мякчэйшая, больш рухаецца. Трэба пільна сачыць за паверхняй», — кажа ён.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

❍ Дарэчы

Сёлета ў Карэліцкім раёне пад збожжавыя і зернебабовыя культуры адведзена 19 937 гектараў, найбольшая колькасць з якіх — 2600 — у калгасе «Чарняхоўскі-Агра». З 560 гектараў тут намалацілі 2412 тон. Ураджайнасць у раёне, дарэчы, у 2020-м большая за леташнюю: 55,1 ц/га супраць 52,5. А вось рапс на Карэліччыне сабралі ўжо амаль цалкам: 2447 гектараў з засеяных 2516. Па колькасці плошчы, адведзенай пад гэтую культуру, «Чарняхоўскі-Агра» са сваімі 280 гектарамі на трэцім месцы.

ПРУЖАНСКІЯ ЛІСІЧКІ ЕДУЦЬ У ПАРЫЖ СЛЕДАМ ЗА ЧАРНІЦАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Загадчыца вытворчасці Валянціна ЗАВЯРУХА цэлую змену круціцца як тая вавёрка ў коле паміж радамі перабіральшчыц. Нарыхтоўкамі Валянціна Іванаўна займаецца больш за 20 гадоў, апошнія восем працуе ў кампаніі «Экалесапрадукт».

— Цяпер актыўна ідуць лісічкі, — кажа яна. — Толькі на першы погляд можа здацца, што нарыхтоўваць дары лесу не такая складаная справа. Так, нам не патрэбны розныя станкі ды механізмы для вытворчасці. Але насамрэч складнікаў поспеху работы нямала. Свой уплыў аказваюць надвор'е, стан навакольнага асяроддзя. Нават мясцовасць накладвае адбітак на смакавыя ўласцівасці прадукцыі. А спажывец арыентаваны на высокую якасць. Таму кожны грыб павінен быць перабраны, праверaны на адпаведнасць і якасць рукамі нашых перабіральшчыц. Да таго ж грыбы, фасаваныя ў скрынкі, павінны мець не проста таварны выгляд, а выгляд прывабны, нібы з карцінкі. Еўрапейскія партнёры патрабавальныя, і мы ніколі іх не падводзілі. Нас ведаюць у многіх краінах Еўропы. Цяпер, напрыклад, частка партыі лісічак, якія сабраны ў ваколіцах Белавежскай пушчы, накіроўваецца ў Парыж, заказ зрабіў рэстаран Эйфелевай вежы. Вядома, еўрапейскія партнёры на першы план заўсёды ставяць экалагічнасць прадукцыі, таму мы правяраем грыбы, ягады на радыяцыю, на прымесі шкодных рэчываў і толькі пасля таго, як упэўніліся, што прадукцыя цалкам чыстая, даём ёй далейшы ход.

Калі Валянціна Завяруха можа прачытаць цэлую лекцыю пра ўласцівасці лісічак, дык **Аксана КОЎЧ, загадчыца секцыі прыёмкі,** усё ведае пра чарніцы:

— Ягаду мы пачалі прымаць у пачатку ліпеня. Летась, напрыклад, сезон нарыхтоўкі стартаваў раней, многае залежыць ад асаблівасцяў надвор'я. Наогул жа беларускія чарніцы вельмі смачныя і карысныя. А вось самую прыгожую і буйную ягаду прывозяць з ваколіц пушчы. Наша задача — хутка замарозіць чарніцы і адправіць пакупніку з нерастрачаным наборам вітамінаў і мікраэлементаў. Таму ў памяшканні маразільнай камеры падтрымліваецца тэмпература мінус 18, і працаваць пэўны час даводзіцца ў ватніку, хоць за акном плюс 30. Але гэта не ўвесь час, а на апошніх стадыях шматступеннага кантролю.

Цэх пераборкі.

Фота Сяргея ТАЛАШКЕВІЧА.

Аксана па спецыяльнасці — эканаміст, працуе тут трэці сезон, работай задаволена, мяняць яе не збіраецца.

Цяпер у Купліне апрацоўваюць прадукцыю з чатырох абласцей Беларусі, а пастаўкі даўно выйшлі за межы Еўропы. Напрыклад, праз пасярэднікаў пружанскія ягады і грыбы набываюць кампаніі з Канады, Кітая, іншых краін на розных кантынентах. Прадпрыемства мае свае халадзільныя камеры, камеру шокавай замарозкі. Апошняя дазваляе захоўваць першапачатковую якасць прадукту, павялічваць яго тэрмін захавання пры мінімальнай апрацоўцы, бо атрымальнік прадукцыі самастойна даводзіць тавар да патрэбнай яму кондыцыі. Другая частка прадукцыі праходзіць дасканалую ачыстку, замарожваецца і ўпакоўваецца, затым накіроўваецца ў гандлёвую сетку. Вядома, не ўсё ідзе на экспарт — у нашых крамах таксама прадаюцца замарожаныя ягады з Пружан.

Частка партыі лісічак, якія сабраны ў ваколіцах Белавежскай пушчы, накіроўваецца ў Парыж, заказ зрабіў рэстаран Эйфелевай вежы.

— Для праверкі якасці ў нас ёсць усё неабходнае абсталяванне, — кажа **прыёмшчыца Надзея ВАСІЛЕЎСКАЯ.** — Мы карыстаемся нарматывамі, распрацаванымі абласной санітарнай службай. Працэс праверкі арганізаваны так, што мы адказваем за кожную партыю ягад ці грыбоў.

Надзея працуе ў кампаніі «Экалесапрадукт» нядаўна. Зарплата, умовы працы, калектыў яе задавальняюць. На работу дзяўчына, як і многія яе калегі, едзе з райцэнтра аўтобусам прадпрыемства. Працаваць падабаецца. Толькі вось адносіны да тых, хто стараецца летам зарабіць на зборы ягад, у яе змяніліся. Адны людзі падыходзяць да справы адказна, акуратна збіраюць спелыя чарніцы, а іншыя могуць з дапамогай розных прыстасаванняў налупіць зялёных з лісцем, галінкамі, не зважаючы на расліну. А так рабіць нельга, гэта вядзе да спусташэння прыроды. І, вядома, такую ягаду ніхто не прыме, нагадала прыёмшчыца.

— У нас няма дастатковага запасу карысных выкапняў, але ёсць аднаўляльныя рэсурсы, — разважае Валерый Баярын. — Толькі вось распараджацца імі трэба з розумам, з павагай да прыроды, і можна атрымліваць добры эканамічны эфект. Нашы лясы даюць чыстую прадукцыю, гэта ацаніў еўрапейскі спажывец. Нездарма ж нават падчас пандэміі ніводная краіна ЕС не закрыла граніцы для фур з замарожанымі ягадамі — наадварот, яны рады атрымліваць вітамінную прадукцыю, якая спрыяе ўмацаванню імунітэту. А мы гатовыя яе паставіць.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Пружанскі раён.

Удалае ціхае паляванне

У час адпачынку магіляўчанка Ірына Філіпава абавязкова едзе на малую радзіму сваёй бабулі, у Глускі раён, каб наведаць родныя мясціны (з якімі ў яе звязана шмат дзіцячых прыемных успамінаў) і абавязкова схадзіць у лес у грыбы і ягады. Мая суразмоўніца прызнаецца, што тут яна адпачывае душой.

— Люблю лес з дзяцінства. Я такая шчаслівая, калі іду па яго сцяжынках! — расказвае Ірына Міхайлаўна, якая працуе настаўнікам-дэфектолагам. — Я часта маленькай дзяўчынкай хадзіла са сваёй бабуляй збіраць дары лесу. Цяпер і сама ведаю нямала грыбных месцаў. Выходжу вельмі рана, па праверaным маршруце. Часта са мной побач пляменнікі *(на фота)*. Яны, як і я, шчыра радуюцца кожнаму грыбочку, адчуваюць іх здалёк. Лес дорыць столькі станоўчых эмоцый, ад якіх за спіной вырастаюць крылы!

Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.

Новыя кнігі

КРОК ДА ГІСТОРЫІ

ПАДАРОЖЖА ДЛЯ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ

У сталіцы прэзентавалі выдавецкія праекты для краязнаўцаў, экскурсаводаў і турыстаў. Вядучы спецыяліст выдавецтва «Беларусь» Анжэла САДОЎСКАЯ расказала, што такія выданні, як правіла, выходзяць на трох мовах: рускай, беларускай і англійскай. Гэта дазваляе зрабіць іх даступнымі ў тым ліку для замежнага турыста.

— Адным з апошніх выйшаў альбом вядомага фотамастака, супрацоўніка «Звязды», Анатоля Клешчука «Пад небам Беларусі». Гэта ўжо чацвёртае выданне з абсалютна новымі фотаздымкамі, якія адлюстроўваюць прыгажосць прыроды, жывёльнага і расліннага свету Беларусі ў розныя часы года. Таксама нядаўна быў прэзентаваны фотаальбом «Мір. Замак», які змяшчае вялікі ілюстрацыйны і тэкставы матэрыял і можа стаць выдатным падарункам для гасцей краіны. Новая кніга Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Гродзеншчыны» — сапраўдны бестселер. Мы штодня атрымліваем да 10-15 званкоў з пытаннем, дзе можна набыць выданне. Гэта працяг першай часткі, якая выйшла ў 2014 годзе. У аснове кніг — вялікая пошукавая работа. Матэрыял будзе вельмі карысны для гідаў пры распрацоўцы маршрутаў па пэўным рэгіёне. Да таго ж больш за дзесяць кніг апублікавана ў серыі «Падарожжа па родным краі», прымеркаванай да Года малой радзімы. Сярод іх выданні Алеся Карлюкевіча «Ігуменскі павет», Юрыя Кур'яновіча «Тураў старажытны і сучасны» і іншыя. Гэта серыя кніг будзе прадоўжана.

Анжэла Садоўская таксама звярнула ўвагу на даведнік Мікалая і Яўгена Чыркіх «Мінск: даведнік турыста», двухтомнік Віктара Корбута і Дзмітрыя Ласько «Мінск. Спадчына Сталіцы Беларусі 1918-2018» і «Мінск. Спадчына старога горада», які дапаможа бліжэй пазнаёміцца з беларускай сталіцай, а таксама на даведнік «Беларусь запрашае», перакладзены на англійскую, французскую і кітайскую мовы, дзякуючы якому можна даведацца пра славутасці і архітэктуру ўсіх абласцей краіны, а таксама пра беларускую кухню.

Дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга ВАНІНА расказала пра выданне Мікалая Півавара «Сядзібы Віцебшчыны». «Яно не толькі змяшчае карту-схему размяшчэння сядзіб у рэгіёне, але і апавядае пра іх стан. Аўтар працаваў над ім каля дзесяці гадоў, там пададзены цалкам эксклюзіўны матэрыял. Кніга добра ілюстраваная, але мы не ставілі мэтай зрабіць яе прэзентацыйнай. Яна больш для экскурсаводаў, для тых, хто працуе з дзецьмі, у аддзелах культуры, хто жыве ў гэтым раёне і цікавіцца яго славутасцямі».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **унитарное предприятие «Ружанская мебельная фабрика»** (УНП 200254688) 225295, Брестская обл. Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Заводская, д. 4, в лице управляющего в деле о банкротстве ООО «ПРАЙМДИРЕКТ», тел. +375 (29) 795-55-39.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 142-10Б/2018 в экономическом суде Брестской области будут проведены: **31 августа 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Внутриплощадочные дороги и проезды – площадь – 2889 м², год постройки – 1989	26 216,00	15 729,60
2	Теплотрасса (инв. № по б/у 77) – протяженность – 158 м	4 820,00	2 892,00
3	Дебиторская задолженность ИП Луцик В. С. перед УП «Ружанская мебельная фабрика»	47 745,25	31 034,41
Местонахождение – Брестская обл., Пружанский р-н, Шерешевский с/с, г.п. Шерешево, ул. Урицкого, 1А, тел. для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 53			

Для участия в торгах необходимо в срок с 30.07.2020 г. 09.00 по 28.08.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее десяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Подробнее на beltorgi.by.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего в деле о банкротстве Мясоедова Руслана Федоровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **18 августа 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	капитальное строение с инв. № 710/С-3768, заводоуправление, корпус № 24, общей площадью 1 028,4 кв. м, 1961 года постройки	416 160,00	293 760,00
2	автомобиль грузопассажирский специальный УАЗ 39629-016, 2006 г. в., кузов (рама) 39620060215368	4 590,00	3 240,00
3	автомобиль грузовой, бортовой ЗИЛ-431410, 1988 г. в., кузов (рама) № 2698587	3 162,00	2 232,00
4	автомобиль грузовой, бортовой, ЗИЛ 431416, 1987 г. в., кузов (рама) № 2700372	3 060,00	2 160,00
5	автомобиль грузовой, бортовой тентовый, ГАЗ 3307, 1992 г. в., кузов (рама) ХТН330700N1397358	3 162,00	2 232,00
6	автомобиль грузовой, бортовой тентовый, ГАЗ 3307, 1992 г. в., кузов (рама) ХТН330700N1507001	3 162,00	2 232,00
7	автомобиль грузовой, бортовой тентовый, КАМАЗ 5320, 1991 г. в., кузов (рама) КАБ 1378239 ХТС532000М0383936	3 978,00	2 808,00
8	прицеп СЗАП 8357, бортовой тентовый, г. в. не определен, кузов (рама) № б/н	4 284,00	3 024,00
9	прицеп бортовой МАЗ 8926, 1988 г. в., кузов (рама) № 872575	1 836,00	1 296,00
10	полуприцеп МТМ 9330, 2001 г. в., кузов (рама) № Y3D93301110001503	7 038,00	4968,00
11	полуприцеп бортовой МАЗ 93866, 1992 г. в., кузов (рама) N0001118	2 754,00	1 944,00
12	полуприцеп бортовой МАЗ 9380, 1991 г. в., кузов (рама) ХТМ9380001000006665	2 142,00	1 512,00
13	капитальное строение с инв. № 710/С-5756, здание клуба, общей площадью 1148,0 кв. м, 1961 года постройки, (литер 23Б 2/к)	282 030,00	199 080,00
14	капитальное строение с инв. № 710/С-70668, здание столовой, общей площадью 1409,5 кв. м, неизвестен год постройки, (литер Б2/к)	399 840,00	282 240,00
15	капитальное строение с инв. № 710/С-73856, здание склада, общей площадью 4406,4 кв. м, 1982 года постройки, (литер Б1/к)	375 504,00	262 944,00
16	капитальное строение с инв. № 710/С-3772, 5-ти этажное здание архива и отдела кадров, корпус № 72, общей площадью 738,0 кв. м, 1973 года постройки, (литер 72Б 5/к)	241 740,00	170 640,00
17	капитальное строение с инв. № 710/С-67807, участок производства резиновых нитей из латекса, общей площадью 2645,3 кв. м, 1970 года постройки, (литер Б1/к)	333 540,00	235 440,00
18	Полуприцеп МАЗ 93801, бортовой 1991 года выпуска, кузов (рама) шасси – 064	2 346,00	1 932,00
19	Прицеп тракторный 2 ПТС-4, год выпуска не установлен, заводской номер б/н, рег. знак 5948 БЮ, инв. № 8365	2 142,00	1 764,00
20	Экскаватор ЭО-3322И, г. в н. у., инв. № 8362	8 364,00	6 888,00
21	Фронтальный погрузчик ТО-18, 1988 г. в., заводской № 923996	14 484,00	11 928,00
22	Экскаватор одноковшовый ЭО -2621, г. в. н. у., заводской номер н. у., инв. № 8361	4 590,00	3 780,00
23	Полуприцеп МАЗ 9758, бортовой тентовый, 1999 года выпуска, кузов (рама) № Y3M975800X0001278	5 202,00	4 284,00
24	Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 131, 1988 г. в., кузов (рама) 779653	6 324,00	5 208,00
25	Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 130, 1985 г. в., кузов (рама) 2346484	6 120,00	5 040,00
26	Станок радиально-сверлильный 2 Е52, инв. № 2031	2 346,00	1 932,00
27	Круглошлифовальный станок, инв. № 6025	5 916,00	4 872,00
28	Станок плоскошлифовальный, инв. № 6031	7 650,00	6 300,00
29	Станок плоскошлифовальный, инв. № 6032	3 570,00	2 940,00
30	Станок трубогибочный, инв. № 6038	1 122,00	924,00
31	Станок торцовочный (ленточная пила), инв. № 9514	1 632,00	1 120,00
32	Станок строгальный четырехсторонний, инв. № 9536	3 570,00	2 940,00
33	Координатно-расточной станок КР-450, инв. № 9537	2 550,00	2 100,00
34	Поперечно-строгальный станок, инв. № 28807	3 876,00	3 192,00
35	Станок фрезерный ОФ-55, инв. № 28813	6 630,00	5 460,00
36	Бензиновый снегоуборочник GST 110EL VT (5595840)	2 052,00	1 710,00
Местонахождение – **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102**, тел. +375 29 698-53-53 подробная информация на BELTORGI.BY			

Для участия в торгах необходимо в срок с 30.07.2020 г. 09.00 по 17.08.2020 г. 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее десяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает об отмене аукциона, назначенного на 30.07.2020 в 12.00, по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении РУСПП «Могилевское Госплемпредприятие». Информация об аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 26.06.20.

УНП 190055182

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 14 августа 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**			
Местонахождение лота: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4в				
1	**КТП 804**, инв. № 10000007	**6 700,00**	335,00	670,00

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой**»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 июля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 12 августа 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты на публикацию в газете «Звязда», затраты на публикацию извещения на сайте www. bankrot.gov.by, затраты по ранее несостоявшимся торгам в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 13.02.2020 г. № 29 (29143).**

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62

ООО «ИПМ-Консалт оценка» сообщает о проведении 14.08.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703 повторных торгов в форме аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ООО «Компания КриК»

Лот № 1. Здание производственного цеха (здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий). **Составные части и принадлежности**: подвал, две пристройки, мощение (асфальтобетон), инв. № 250/С-35403, общ. пл. 1029,1 кв. м. **Земельный участок** пл. 0,2066 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания производственного цеха. **Адрес**: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. п. Ветрино, ул. Ленина, 78. Начальная цена: **60 050,00 бел. руб. без НДС**. Шаг аукциона: **3 002,50 бел. руб**.

Для участия в аукционе необходимо подать организатору торгов заявление с приложением всех необходимых документов, а также перечислить задаток в срок **с 9.00 28.07.2020 до 17.00 12.08.2020** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка».

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка».

Ознакомление с предметом торгов: Кудренок Елена Александровна, 375 (29) 644-38-92.

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» (далее – Закон).

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 12.08.2020 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 Закона. Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену. Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол.

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 15 (пятнадцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Подробная информация о порядке проведения аукциона размещена на сайтах www.bankrot.gov.by, ipmtorgi.by.

Контактные данные организатора торгов: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by

РАЗВЯЗКА БЫЛА НЕЧАКАНАЯ

Не так даўно быў сведкам двух выпадкаў у фірменнай краме мазырскага саўгаса-камбіната «Зара». Яна знаходзіцца на вуліцы Сялянскай у Гомелі, і заўсёды, калі завозіцца новы тавар, там не прапхнуцца. Па зразумелай прычыне: мясныя разрубы, сальцісоны, каўбасы і г. д. намнога таннейшыя, чым у іншых гандлёвых пунктах горада.

Звяртаю ўвагу на пажылога мужчыну, што, абапіраючыся на сваю кавеньку, спрабуе прабіцца наперад, да прадаўшчыцы, але гэта яму яўна не ўдаецца. Нарэшце нейкая жанчына прыстроіла яго каля сябе, і такім чынам ён аказаўся сёмым у той чарзе з больш чым двух дзясяткаў чалавек. Маладзіца напомніла яму, што ён як інвалід мае законнае права пазачарговага гандлёвага абслугоўвання, на што той адказаў: ведаю, ды, па-першае, вы самі бачылі, як спрабаваў я прайсці наперад пры такой таўхатні, а па-другое, не хачу апячыся другі раз.

— Якім чынам? — перапытала жанчына.

— Летам, калі на вуліцах плавіўся асфальт, — уздыхнуў мужчына, — вырашыў купіць марожанага ў гэтай жа самай краме. Без чаргі, вядома. А ў гэты дзень — прывоз тавару якраз. Ахвотных набыць яго — нібы селядцоў у бочцы. І калі стаў прасоўвацца да касы, з натоўпу загулі: куды лезеш, маўляў. Марожанае я ўсё ж набыў без чаргі, але душы ад таго гулу, паверце, стала мулка. Спытаў прадаўшчыцу, чаму ў краме няма аб'явы, хто можа карыстацца пазачарговым абслугоўваннем, дык канкрэтнага адказу так і не атрымаў.

А вось другі выпадак, кастрычніцкі ўжо. У тым жа самым гандлёвым пункце. Гэтым разам гадоў пад сорак жанчына на мыліцах смела накіроўвалася наперад, да прадаўшчыцы, як нейкая цётка, што стаяла пятая ў чарзе, забурчала: куды пхнешся? Жанчына вачыма паказала ёй на свае мыліцы: не бачыш ці што? А тая — з прыціскам у голасе:

— Усе мы інваліды тут. Аднолькавыя. Так што...

І тады тая жанчына, што не кыш-варона была, якая ўсяго баіцца, абвяла цётку з ног да галавы пільным позіркам і смальнула, як з гарматы:

— Яшчэ адно слова, і я ад душы пажадаю табе такіх «цацак», як у мяне...

Развязка была нечаканая для ўсіх: цётка, нібы ашпараная варам, кінулася прэч.

Між іншым, у той жа краме «Дары ад Зары» дагэтуль няма аб'явы пра тое, хто мае права абслугоўвацца ў ёй без чаргі. І не толькі ў ёй. Я абыйшоў некалькі гандлёвых пунктаў у цэнтры горада і ні ў адным з іх такіх аб'яў не знайшоў. А яны, памятаю па нядаўніх часах, паўсюдна былі і (не толькі на маю думку) лішнія не будуць і цяпер. Бо збавяць ільготнікаў ад прэтэнзій і кепікаў у іхні бок некаторых несвядомых грамадзян.

ХАМУТ

Узбадзёрыць сябе свежым паветрам нярэдка адпраўляюся ў парк над Сожам, дзе не чуваць гарадскога тлуму і адкуль адкрываюцца прыгожыя зарэчныя краявіды. А вандроўку гэту звычайна пачынаю ад шахматна-шашачнага клуба, які ўяўляе сабой лёгкую, відаць, металапластыкавую канструкцыю, што часткова адкрытая з двух бакоў і мае над сабой пакаты дах. Яна з'явілася тут некалькі гадоў таму і, акрамя аматараў паламаць свае галовы над хітрамудрымі хадамі ферзёў-коней, сабірае тут і карцёжнікаў. І калі шахматысты паводзяць сябе спакойна, дык тыя, хто рэжацца ў «кінга», «ачко» ды «тысячу», не-не ды агарошваюць у азарце наведвальнікаў парка такімі пакручастымі мацюкамі, што вавёркі, якія круцяцца каля людзей, стралой узлятаюць на дрэвы.

Не абыходзяць гэту будыніну і разявакі, і расказчыкі анекдотаў і цікавых прыгод, і проста мінакі, якія пасля доўгага хаджэння па сцежках-дарожках парку не знайшлі лепшага месца для адпачынку. Адным словам, кожнаму тут ёсць пра што паслухаць і на што паглядзець. Так было і тым разам, калі я праходзіў міма і пачуў выбух смеху. І нечае пытанне пасля яго: «Дык і што з тым клапом сталася?»

У адказ пераказалі нейкі дыялог: « — Папярэджваю, — сказаў ён у слухаўку, — калі паслязаўтра ў мяне на стале не будзе справаздачы — чакайце вымовы на бюро.

— Кусаць будзеш, кроў піць, — падумаўшы, што яго нехта разыгрывае, адказаў голас з другога канца провада. — Дык я цябе дустам пекану, дык адразу апруцянееш».

Тут мужыкі зноў рассыпаліся смехам, і, калі ён памалу згас, я, так нічога не зразумеўшы (бо пачатку аповеду не чуў), спытаў у аднаго з іх: а што гэта за клоп такі?

— Ды, можа, памятаеце, у Гомелі ў свой час з'явілася нейкая камсамольская шышка ў асобе хлопца па прозвішчы Клоп. І вось, як толькі ён узабраўся на гэту пасаду, пра што не ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях яшчэ ведалі, дык, абзвоньваючы іх, прадстаўляўся так: вас турбуе Клоп. Там жа, на другім канцы провада, яго ўспрымалі як нейкага блазнюка і пасылалі да фенькінай мамы і яшчэ далей, або казалі: а вас слухае вош (блыха, гніда і г. д.). Ён вымушаны быў памяняць сваё прозвішча на жончына, і гэта дапамагло яму заняць мяккае крэсла ў адным міністэрстве, — дадаў другі.

Тут слова ўзяў, мяркуючы па ўсім, пенсіянер з вусамі Тараса Бульбы і адтапыранымі вушамі:

— А добры мой знаёмы сказаў — меў конскае прозвішча, і...

Закончыць фразу яму не даў той самы мужык, што растлумачыў мне пра Клапа:

— Ты ж лепш, чым Чэхаў, пра гэта не раскажаш. Так што лепш і не пачынай.

Але тут на яго накінулася кампанія, і «Тарас Бульба», пагладзіўшы вусы, ударыўся ва ўспаміны:

— Я вучыўся з ім у політэхнічным інстытуце, жыў у адным інтэрнатаўскім пакоі. Хлопец — адзіны вясковец у нашай групе. Астатнія — гараджане. Добры па характары, «хвастоў» на экзаменах не меў. І вельмі саромеўся, перажываў за сваё прозвішча. Уявіце: у наш цывілізаваны век — Хамут. А ў дадатак яшчэ і імя «вясёленькае» — Ферапонт. Ферапонт Хамут. Гучыць? Каб не біць па нервах аднагрупніка, мы называлі яго Ігарам, і гэта яму падабалася.

— Некалькі разоў, — працягваў «Тарас Бульба», — ён дапытваўся ў бацькі, хто даў іх роду такое прозвішча. І пачуў: пан Шмігельскі, які валодаў некалькімі вёскамі і сотнямі прыгонных сялян. Яго маёмасцю яны былі. Што хацеў, тое і рабіў. Па яго загадзе за ўсякую правіннасць чалавека маглі пабіць да паўсмерці і не несці адказнасці. Ды «конскае» прозвішча яшчэ неблагое. А ўзяць іншыя, якія ён даваў прыгонным: Дундук, Гніляк, Смаркач, Кішкун, Свістун, Дрыстун і гэтак далей.

— Таму б пану ды скуляку з кулак на яго азадак, — абураўся Ферапонт. — Ну а імя хто прыдумаў такое?

— Хто? Поп. У нейкай царкоўнай кнізе знайшоў яго, калі панеслі хрысціць.

— І яму такую ж скуляку.

Пры знаёмствах з дзяўчатамі Ферапонт праўдзіва называў сваё імя і прозвішча. І гэта, прабачце, выклікала ў іх смех і непрыязнасць: «дзярэўня», маўляў. Ніхто не хацеў з ім сустракацца, каб стаць у замужжы, калі дойдзе да гэтага, Хамутом, а дзяцей зрабіць Ферапонтавічамі. Таму ён афіцыйна памяняў сваё імя і прозвішча, якія сталі гучаць так: Ігар Каліноўскі (як шляхціч). І вось ужо сам, знаёмячыся з дзяўчатамі, якія называлі сябе Марыямі, Ганнамі, Фросямі, Надзеямі, даваў ім ад варот паварот: не хацеў больш сустракацца. А ў жонкі ўзяў гараджанку Эсмеральду Серафімаўну, мяркуючы, што яна з такім імем на сто працэнтаў належыць да чыста шляхецкага роду. Маўляў, ведай нашых. І толькі ў загсе даведаўся, што яе прозвішча было... Жарабцова.

Зноў выбух смеху, ад якога не ўстрымаліся шахматысты-шашысты і, вядома ж, карцёжнікі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АШДВАО

Пагудкі пра гэту бабулю з нашай вёскі хадзілі самыя розныя. У адных насельнікаў яна — прадказальніца, у другіх — вядзьмарка, у трэціх — знахарка, лекар. Адным словам, жанчына-загадка. Што выклікала ў людзей адначасова як павагу, так і асцярогу. Бо мала ці што яна можа ўчыніць чалавеку, які не спадабаецца ёй па той ці іншай прычыне.

Што датычылася нашай сям'і, дык думка адносна Каваліхі была адна: збавіцельніца ад захворванняў. У чым упэўніваліся не адзін раз. Напрыклад, памятаю, як у мяне, сямігадовага, так запарушылася вока, што два дні яго нешта рэзала і цяклі слёзы. Каваліха расправілася з гэтай непрыемнасцю за нейкіх пяць хвілін, пашураваўшы пад маімі павекамі сваім языком. А другі раз, калі мяне так налякаў сабака, што на твар напалі нейкія торганні, яна доўга нешта шаптала нада мной, загадваючы выпіць пры ёй конаўку падфарбаванай пахучай вадкасці. І ведаеце што? Усё прайшло.

А аднойчы да Каваліхі прывялі перапалоханую дзяўчынку, якая паскардзілася, што ў яе жывоціку нешта як бы пераварочваецца, бушуе. Адбылося гэта во, хвілін колькі таму, калі, пасвячы на абалонні свінку і гусей, заснула на затравелым узгорачку. Каваліха, выслухаўшы яе і памацаўшы жывоцік, палажыла на падворку дзяўчынку тварам уніз, паставіла перад ёй сподачак з цёплым малаком, і неўзабаве з рота дзяўчынкі... выпаўз вужык.

Напэўна, многае ведала бабуля. У яе, казалі, была дарэвалюцыйнага часу кніга па медыцыне, куды яна часта заглядвала. А што пад паветкай прасушваліся розныя травы-зёлкі, дык гэта я і сам бачыў.

Карацей кажучы, да Каваліхі нярэдка пракладвалі дарожку тыя небаракі, якіх даймалі розныя непрыемнасці-захворванні: глухата, заіканні, запоры, траўмы, расстройствы страўніка і г. д. І ўсім яна старалася дапамагчы, не адмаўляла і грошай за гэта не патрабавала.

І вось аднойчы, калі восень ужо ішла на спад, да яе ў хату завітаў знаёмы мужык з суседняй вёскі. Павітаўся, прысеў на шырокі ўслон і адразу пачаў жаліцца на жонку-звягу, якая ўжо столькі наварыла з яго вады і ніяк не супакойваецца, усё балабоніць і балабоніць на яго: ты такі і гэтакі, нягоднік, усё робіш не так, на злосць мне. Дык дапамажы неяк, Сцяпанаўна.

Каваліха задумалася. Яна чула пра яго Лукер'ю. З нядаўняга часу — як пра «пілу», у якой рот не закрываўся не толькі на мужа, а і на суседзяў-мужыкоў, з якімі ўступала ў гарачыя спрэчкі. А пра Сямёнавіча водгукі былі самыя добрыя. Іншым разам, праўда, ён спрабаваў агрызнуцца, і гэта яму тут жа адрыгалася, бо з гарлянкі кабеты вырываліся такія праклёны, хоць вушы затыкай. Узважыўшы ўсе гэта, Каваліха параіла яму прыйсці да яе з жонкай.

— Скажы ёй: карты паказалі, што вашу сям'ю чакаюць вялікія непрыемнасці, і я параю, як іх пазбегнуць. Прыходзьце ў любы хмарны вечар, у 21 гадзіну.

І вось сустрэча з сужэнцамі. Сцяпанаўна раскінула карты, нешта растлумачыла ім. Потым доўга разглядвала на далоні жанчыны лінію жыцця і таямнічым голасам падсумавала:

— Калі што і дапаможа табе, галубка, дык толькі ашдвао.

Лукер'я тут жа натапырылася, бо ў яе двухкласнай адукацыі адсутнічала такое загадкавае і страшэннае слова, і адкрыла рот, каб высветліць, што гэта за «звер» такі, але Каваліха толькі махнула рукой і працягвала:

— Ашдвао павінна быць толькі з Азерцаў, што за кіламетр ад нашай вёскі. Там ёсць бруістая крынічка. На золку, паўтараю, на золку, у наступную суботу пойдзеш туды адна, без мужа, набярэш у трохлітровы слоік вадзіцы. Дадому ідзі так, каб ніхто цябе не бачыў. Сталовую лыжку вадзіцы, калі ў душы адчуеш раздражненне, трымаць у роце пяць хвілін. Не меней! А табе, Сямёнавіч, для прафілактыкі, такая норма — чайная лыжка. Калі аслухаецеся, прабачце, жыцця вам добрага не будзе.

Бабулька перахрысціла абодвух, прачытала малітву і адправіла ў сваю вёску. І ведаеце што? У сужэнцаў быў доўгі век. Без папрокаў, без крыку, а ў міры і згодзе. Вось, аказваецца, якая цудадзейная сіла ў той формуле H_2O, якую пачула Каваліха ад унука-дзевяцікласніка, што штудзіраваў хімію. І якая так спадабалася Сцяпанаўне!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Спадчына. Працяг будзе

У Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстаўка «Спадчына Беларусі» — своеасаблівае падвядзенне вынікаў, але не кропка і нават не шматкроп'е, а чарговае звяно ў ланцужку аднайменнага мастацкага праекта, што доўжыцца ўжо амаль 20 гадоў. Яго аўтары Алег ЛУКАШЭВІЧ і Аляксандр АЛЯКСЕЕЎ расказалі пра тое, чаму так важна ведаць, вывучаць і ганарыцца сваёй спадчынай і як з адной ідэі выраслі прэзентацыйны фотаальбом, дакументальныя фільмы і шэраг нацыянальных і міжнародных выставак, якія паказваюць суайчыннікам і замежнікам прыгажосць і значнасць гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай краіны.

«Праект «Спадчына Беларусі» — напэўна, самы значны і вядомы за апошнія дзесяцігоддзі ў галіне нацыянальнай культуры, — мяркуе **старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ.** — Ён важны для нашай краіны ў цэлым, бо паказвае свету іншую — не «сярмяжную», а духоўна і гістарычна багатую, прыгожую, разнастайную Беларусь».

Прысвечаная Беларусі кніга-альбом нарадзілася, як ні дзіўна, у Парыжы. «Мы зайшлі ў адну з буйных кніжных крам, — згадвае Аляксандр Аляксееў, — і паглядзелі, што напісана пра Беларусь у самых вялікіх, тоўстых энцыклапедыях і турыстычных даведніках. На жаль, напісана было вельмі мала — у лепшым выпадку старонка: фота і статыстычныя звесткі пра плошчу, насельніцтва краіны і да таго падобнае. І мы зразумелі, што ў большасці замежнікаў проста няма паўнавартаснай і праўдзівай інфармацыі пра нашу краіну, і калі мы хочам, каб уяўленне змянілася, трэба зрабіць гэта самім». Доўга спрачаліся наконт формы падачы матэрыялу пра розныя славутасці і архітэктурныя помнікі нашай краіны — якой мовай пісаць, навуковай ці больш сучаснай, ці трэба ўключаць усе рэгіёны, ці прытрымлівацца алфавітнага прынцыпу або нейкага іншага... А потым Аляксандр Аляксееў і Алег Лукашэвіч з'ездзілі ў Полацк, каб пакланіцца мошчам святой Еўфрасінні Полацкай ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры — і дзіўным чынам у той жа вечар прыйшлі да згоды. Палічылі гэта добрым знакам, і з таго часу менавіта абраз нябеснай апякункі і заступніцы зямлі беларускай адкрывае кожнае выданне. Зрэшты, да выхаду альбома ў свет мінула яшчэ тры гады — столькі часу спатрэбілася, каб правесці грунтоўныя навуковыя даследаванні ў музеях і архівах, сабраць і апрацаваць вялікі масіў неабходнай інфармацыі пра помнікі гісторыі і архітэктуры, каб самім зразумець і адлюстраваць глыбіню і значнасць гэтых аб'ектаў.

Першая кніга-альбом убачыла свет у 2004 годзе — аб'ёмнае выданне на 320 старонак з тэкстамі на рускай, беларускай і англійскай мовах, упрыгожанае больш чым 400 фотаздымкамі гістарычных аб'ектаў, архітэктурных помнікаў і артэфактаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У кожным наступным перавыданні аўтары дапаўнялі і абнаўлялі гэтыя звесткі, так што «Спадчына Беларусі» стала своеасаблівым летапісам аднаўлення і захавання нацыянальнай спадчыны. Дапоўнілі праект звыш 30 дакументальных стужак, якія расказвалі пра ўраджэнцаў Беларусі — слаўных дзеячаў гісторыі і культуры: праз сустрэчы з нашчадкамі, работу ў архівах, навуковыя даследаванні раскрылі малавядомыя старонкі іх біяграфіі. Нарэшце, трэцім складнікам праекта сталі фотавыстаўкі, якія адбыліся ў Беларусі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі і іншых краінах блізкага і далёкага замежжа.

Цяперашняя выстаўка ўпершыню раскрывае ўсе аспекты маштабнай працы — да 23 жніўня ў экспазіцыйнай зале можна параўнаць выданні кнігі-альбома розных гадоў і паглядзець кадры з дакументальных фільмаў, прыгадаць, разгледзець славутасці з усіх рэгіёнаў Беларусі і скласці для сябе маршрут, каб убачыць гэтыя помнікі ўжо на ўласныя вочы...

Праект быў высока ацэнены ў нашай краіне — у 2005-м Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў атрымалі з рук кіраўніка дзяржавы прэмію «За духоўнае адраджэнне». А далей аўтараў чакаў і камерцыйны поспех (тыражы кожнага перавыдання альбомаў, а сумарны наклад роўны 46,5 тысячы паасобнікаў, не залежваюцца ў кнігарнях), і міжнароднае прызнанне (кнігі і фільмы прадстаўленыя ў фондах вядучых бібліятэк, універсітэтаў і музеяў свету, у дыпламатычных установах і прыватных калекцыях вядомых людзей, ад каралевы Вялікабрытаніі да Папы Рымскага). Цяпер жа «Спадчына Беларусі» вылучаная на суісканне Дзяржаўнай прэміі Беларусі за 2020 год. І, мабыць, менавіта гэта — найлепшае сведчанне запатрабаванасці работы даследнікаў і стымул рухацца далей, кажа Алег Лукашэвіч: «Мы не любім гаварыць пра планы, але працяг абавязкова будзе. Ёсць, напрыклад, сярод ідэй прапанова зрабіць асобную кнігу паводле цыкла фільмаў, якія выходзілі з 2005 года, — магчыма, ажыццявім яе».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Творцы

АРХІТЭКТУРА МАСТАЦТВА

Як жывецца жывапісцу ў глыбінцы

На ўскраіне Узды можна знайсці не зусім стандартны для Беларусі жылы будынак — у доме, выкананым у шатровым стылі, жыве беларускі мастак Андрэй ЛЫЧКОЎСКІ. Туды разам з сям'ёй ён пераехаў у канцы 1990-х, калі такое архітэктурнае рашэнне было дзівам.

Праектаваннем свайго дома Андрэй Міхайлавіч не займаўся, а знайшоў схему ў венгерскім часопісе. Адразу вырашыў, што яго будучае жыллё будзе выглядаць менавіта так.

— Я мастак, а не архітэктар, але нейкія карэктывы ў праект усё ж такі ўнёс — напрыклад, ванны пакой я зрабіў на першым паверсе, а не на другім. У канцы 1990-х такі праект сапраўды быў дзівам, але і цяпер многія не перастаюць здзіўляцца — наш дом і шпакоўняй называлі, і жартавалі, што сам дом праваліўся і застаўся толькі дах. Пры гэтым многія скептычна ставяцца да такога рашэння: на іх старонні погляд, дом нефункцыянальны, у ім мала месца. Але гэта не так: яго агульная плошча — 160 квадратных метраў, тут пяць жылых пакояў, кухня і сталовая, знайшлося месца для майстэрні, гардэробнай і двух санвузлоў. Гэтага было дастаткова для сям'і з чатырох чалавек, а дачка вельмі радавалася таму, што можа ўпірацца нагамі ў столь у сваім пакоі. Цяпер жа мы жывём з жонкай удваіх, і дома заўсёды хапае месца не толькі дзецям, але і ўнукам. Зразумела, такі дом патрабуе шмат увагі: ты тут сам сабе гаспадар — і будаўнік, і дызайнер, і нават камунальная служба. Самае складанае, мабыць, добраўпарадкаванне тэрыторыі. Шмат часу аддаеш на азеляненне — трэба кожны раз даглядаць газоны, кветкі, кусты і дрэвы. А за домам яшчэ ёсць сажалка, у якой жывуць рыбы ды растуць белыя гарлачыкі.

Нягледзячы на тое, што ўтрыманне такога дома аднімае шмат часу, гэта не перашкаджае Андрэю Міхайлавічу ўдзяляць увагу сваёй самай галоўнай справе — выяўленчаму мастацтву. Ужо 150 работ мастака размешчаны ў выставачных фондах і пастаянных экспазіцыях многіх музеяў і галерэй Беларусі, і кожны год ён ладзіць па некалькі персанальных і сумесных выставак з іншымі мастакамі.

— Ужо на працягу дзесяці гадоў мы з мінскімі мастакамі Фёдарам Ладуцькам і Яўгенам Шунейкам ездзім па Беларусі — выязджаем на пленэры, ладзім сумесныя выстаўкі ў музеях і галерэях, падчас якіх праводзім майстар-класы для гасцей. За гэты час мы пазнаёміліся з многімі іншымі беларускімі мастакамі — пастаянна супрацоўнічаем з Таццянай Здановіч і Анатолем Маразюком з Бярозы, з Тамарай і Аляксандрам Стацэнкамі, Казімірам Кулешам і Васілём Грыневічам са Слоніма. Наогул у Беларусі шмат добрых мастакоў. Прыязджаеш у нейкі раён, і ўсюды ёсць знаёмыя — хтосьці з кімсьці вучыўся, дзесьці пазнаёміліся падчас выставак. Вядома, сёлета справу сапсаваў каранавірус, і давялося перанесці ўсе мерапрыемствы, але мы спадзяемся, што да восені сітуацыя выправіцца. З-за гэтага перанеслі і рэгіянальны конкурс мастацкіх школ на Берасцейшчыне, дзе мы з калегамі ўжо традыцыйна выступаем членамі журы. Летась з Фёдарам і Яўгенам мы ладзілі шмат сумесных выставак — у Бярозе, Слоніме, Мінску, Уздзе, Пінску, Ружанах і Косаўскім палацы.

Дарэчы, на такіх мерапрыемствах з'яўляюцца і ахвотныя набыць карціны мастакоў, просяць намаляваць на заказ. Аднак звычайна ад такіх прапаноў Андрэй Міхайлавіч адмаўляецца і не ставіць мэты зарабляць на мастацтве.

— Менавіта на заказ я карціны ніколі не маляваў — не бачу ў гэтым сэнсу. Прадаю іх толькі выпадкова — здараецца, што чалавек захоча нешта набыць на выстаўцы, — але не імкнуся да гэтага. Наогул я лічу, што пісаць на продаж за нейкую сімвалічную цану — не мастацтва. Куды важней пакінуць след пасля сябе — тыя ж работы для папаўнення выставачнага фонду галерэі ці музея, калі ў іх няма грошай іх набыць. І вельмі ж добра, калі мае ўнукі будуць праз гады бачыць мае карціны ў беларускіх музеях. Многія мастакі шмат малююць, але не любяць дарыць свае работы музеям ці галерэям. У выніку можа здарыцца і такое, што мастак пайшоў з жыцця, а яго карціны знаходзяць нават на сметніках, хоць мастак быў выдатны. Хтосьці ж, наадварот, ладзіць выстаўкі з аднымі і тымі ж работамі, якім ужо больш за дваццаць гадоў, а новага нічога няма. Датычыцца гэта і буйных выставак у Мінску — бясспрэчна, сярод мастакоў яны лічацца прэстыжнымі, але, на мой погляд, гэта крыху фальшыва ў нейкім сэнсе. Каму цікава прыходзіць і бачыць адны і тыя ж работы адных і тых жа мастакоў?

Тым не менш цікавыя заказы, ад якіх цяжка адмовіцца, таксама прапаноўваюць. Некалькі гадоў таму да мастака і яго калегі звярнуліся мінчане з просьбай распісаць сцяну ў іх кватэры.

— Адразу мы падрыхтавалі эскізы, каб людзі ўяўлялі, як усё будзе выглядаць. У выніку на сцяне з'явіўся італьянскі дворык, які мы намалявалі акрылавымі фарбамі, і з гэтай работай мы справіліся за адзін дзень. Пасля я атрымаў цікавы заказ, і разам з Яўгенам Шунейкам мы распісалі пад'езд у жылым доме Дзяржынска — на кожным пралёце з'явіліся паўнавартасныя карціны з беларускімі матывамі.. Для роспісу мы таксама выкарыстоўвалі акрыл, а на кожную з карцін пайшло каля трох гадзін, прытым што недзе мы падпраўлялі работы адзін аднаго. Канешне, яшчэ ў савецкі час я займаўся роспісам сцен, маляваў плакаты. Але гэта былі афарміцельскія работы, такія ж цяпер можна сустрэць і ва Уздзе на фасадах жылых дамоў — пра небяспеку тых жа пажараў. Каму яны зараз патрэбны? Такія работы ніяк не назавеш высокім мастацтвам, яны зусім не ўпрыгожваюць горад. Роспіс фасадаў зарадзіўся за мяжой, і беларусам таксама трэба развіваць вулічную эстэтыку. Добрыя творчыя работы прыцягваюць турыстаў, становяцца мясцовымі славутасцямі. І каб гэты кірунак быў прафесійны, неабходны савет мастакоў, у які б уваходзілі спецыялісты сваёй справы. Асабіста мяне натхняе творчасць славутага андэграўнднага мастака Бэнксі — у яго работах ёсць сэнс, яны добрыя з мастацкага пункту гледжання.

Што ж датычыцца стылю Андрэя Лычкоўскага, то ён працуе з алейнымі фарбамі, а карціны піша ў асноўным на пленэрах круглы год. Цяпер Андрэй Міхайлавіч знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Дагэтуль ён працаваў у мясцовай школе № 2 імя Кандрата Крапівы — выкладаў выяўленчае мастацтва і ладзіў дадатковы гурток для сваіх вучняў. Некаторыя з іх і да гэтай пары выязджаюць разам з настаўнікам на пленэры.

Валерыя КІСЛАЯ,
фота аўтара.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Салон прыгажосці

Вейкі як у лялькі

Эксперт аб супрацьпаказаннях і небяспеках моднай працэдуры

Сёння дзяўчаты і жанчыны ўсё часцей звяртаюцца па дапамогу спецыялістаў у сферы прыгажосці для надання твару той самай чароўнай магіі натуральнасці: ты толькі што прачнулася, а ўжо свежая і прыгожая. Да такіх працэдур адносіцца нарошчванне вейкаў. Мы даведаліся, каму гэта супрацьпаказана, якія ёсць абмежаванні і магчымыя непрыемныя наступствы.

Урач-эпідэміёлаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марыя КАСТЭНКА кажа, што першае, на што варта звярнуць увагу, — гэта наяўнасць алергіі.

— У састаў клею ўваходзіць дастаткова моцны алерген цыянаакрылат, рэакцыя на які можа выявіцца і пасля некалькіх працэдур ад пачатку нарошчвання. Праяўляецца такая алергія па-рознаму, найбольш частымі сімптомамі з'яўляюцца пачырваненне павекаў, сверб, накапленне гною, апуханне верхніх ці ніжніх павекаў, чырвоная рагавіца.

А вось пачуццё пякоты падчас працэдуры пры шчыльна закрытым павеку можа сведчыць пра рэакцыю слізістай на клей, а таксама магчымыя далейшыя негатыўныя праявы. Адчуўшы гэта, трэба неадкладна звярнуцца да майстра з просьбай зняць вейкі (выдаліць з дапамогай растваральнага сродку клей і штучны матэрыял). Калі алергія не прайшла, варта наведаць урача. Праўда, у большасці выпадкаў пасля зняцця матэрыялу далейшага лячэння не патрабуецца.

— Яшчэ адзін выпадак, які прымусіць звярнуцца да доктара, — пачырваненне рагавіцы цягам трох і больш дзён пасля нарошчвання. Яно сведчыць пра апёк рагавіцы, — тлумачыць Марыя Кастэнка. — Гэта можа ўзнікнуць пры няпоўным змыканні павека ў працэсе нарошчвання, калі пара клею трапляе на рагавіцу. У такім выпадку няма асаблівай неабходнасці здымаць прыклееныя вейкі, але ўрача варта наведаць, а ў далейшым выбіраць больш вопытнага майстра.

Да супрацьпаказанняў, акрамя алергіі, таксама адносяцца бранхіяльная астма, эпілепсія, псарыяз, дэмадэкоз, захворванні вока (кан'юнктывіт, блефарыт), ВІЧ, гепатыт B, C, D, анказахворванні, цукровы дыябет, ВРВІ, грып, псіхічная неўраўнаважанасць, нядаўна перанесеныя пластычныя аперацыі на павеках, актыўнае выпадзенне вейкаў. Знізіць тэрміны нашэння нарошчаных вейкаў могуць такія фактары, як менструацыя (1-5-й дзень), прыём гарманальных прэпаратаў, антыбіётыкаў, вітамінаў, а таксама цяжарнасць і лактацыя.

Далікатная тэма

НЕ ЎСЕ ХВАРОБЫ АД НЕРВАЎ

Своечасова заўважыць «падарунак» Венеры і канчаткова вылечыцца ад яго

Паводле звестак экспертаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на планеце кожны шосты жыхар (а гэта звыш мільярда чалавек) пакутуе на якую-небудзь хваробу, якая перадаецца палавым шляхам. І гэтых інфекцый нямала. Разам з найбольш небяспечнымі — сіфілісам і ганарэяй — іх існуе яшчэ каля двух дзясяткаў. Пра самыя распаўсюджаныя захворванні, праявы такіх інфекцый і іх небяспеку мы паразмаўлялі з урачом — акушэрам-гінеколагам жаночай кансультацыі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Ірынай БАРЫСЕВІЧ.

www.ru.depositphotos.com

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— Самымі распаўсюджанымі, акрамя сіфілісу і ганарэі, з'яўляюцца такія інфекцыі, як трыхаманіяз, урэаплазмоз, хламідыёз, мікаплазмоз, мочапалавы кандыдоз, генітальны герпес, востраканечныя кандыломы, генітальны кантагіёзны малюск, гепатыты B і C, цытамегалавірусная інфекцыя, — расказвае Ірына Андрэеўна. — Штогод у свеце рэгіструецца каля 200 мільёнаў хворых на ганарэю, 250 мільёнаў — на трыхаманіёз, 200-250 мільёнаў — на хламідыёз. Самым грозным захворваннем з'яўляецца ВІЧ-інфекцыя, адным з асноўных шляхоў перадачы якой таксама з'яўляецца палавы. ВІЧ, трапіўшы ў арганізм чалавека, з часам разбурае клеткі імуннай сістэмы і вядзе да развіцця сіндрому набытага імунадэфіцыту (СНІД).

У нашай краіне апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да змяншэння захваральнасці на ІППШ. Але, нягледзячы на станоўчую дынаміку, сумарная захваральнасць на сіфіліс, ганарэю, трыхаманіяз, хламідыёз, генітальны герпес, венерычныя бародаўкі за апошнія пяць гадоў склала больш за 230 тысяч выпадкаў.

— Заразіцца такімі інфекцыямі можна толькі пры традыцыйным палавым кантакце?

— Пад выразам «інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам» звычайна маюцца на ўвазе ўсе віды сексуальнай актыўнасці, бо многія ўзбуджальнікі могуць жыць не толькі ў палавых шляхах, але і ў роце, заднім праходзе, вачах і іншых месцах.

— Ці могуць некаторыя з гэтых далікатных праблем прайсці самі?

— Пры ІППШ не можа быць самавылячэння, гэта значыць нельга папраўвіцца без спецыяльнага лячэння. Справа ў тым, што калі не лячыцца, гэтыя хваробы працякаюць доўга і хвалепадобна, прычым часта знешне непрыкметна. Нярэдка здараецца поўная ці амаль поўная адсутнасць праяў інфекцыі, з-за чаго можна ненаўмысна заразіць партнёра. Адзіная невылечная хвароба з усіх ІППШ — СНІД.

Пры праяўленні сімптомаў неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача — так больш шанцаў вылечыцца хутчэй і не атрымаць ускладненняў. Пры нясвоечасовым лячэнні магчымыя ўскладненні, у прыватнасці, захворванне можа стаць хранічным, а яно, адпаведна, менш праяўляецца і горш паддаецца лячэнню. Інфекцыя можа распаўсюдзіцца па мочапалавых шляхах і выклікаць розныя запаленчыя хваробы, а таксама бясплоддзе ў мужчын і жанчын.

Знаёмімся бліжэй

— Колькі часу праходзіць ад заражэння да з'яўлення праяў такіх інфекцый?

— У кожнай хваробы свой інкубацыйны перыяд — гэта час ад моманту інфіцыравання да ўзнікнення клінічных сімптомаў. Для сіфілісу гэта тры-чатыры тыдні, пасля чаго з'яўляецца цвёрды шанкер — гэта язвачка ці эрозія ў тым месцы, дзе ўзбуджальнік пранік у арганізм чалавека. З гэтага моманту чалавек становіцца заразным і застаецца такім да вылячэння.

У цячэнні сіфілісу вылучаюць тры перыяды: першасны (пра яго я расказала), другасны, які ўзнікае праз семвосем тыдняў пасля з'яўлення цвёрдага шанкеру і можа доўжыцца да некалькіх гадоў. У гэты перыяд на целе і канечнасцях, на слізістых могуць з'яўляцца высыпанні, могуць паражацца нервовая і косная сістэма, а таксама ўнутраныя органы. Траційны перыяд, калі хворы не лечыцца, надыходзіць праз тры—шэсць гадоў. У гэты час на скуры, падскурнай клятчатцы, у касцях, унутраных органах, нервовай сістэме ўзнікаюць вузлы, якія могуць распадацца і выклікаць дэструктыўныя незваротныя паражэнні ў органах і тканках. Гэты перыяд доўжыцца ад трох да дзесяці гадоў.

Інкубацыйны перыяд іншых ІППШ вагаецца ад трох-пяці дзён пры ганарэі і трыхаманіязе да 30 дзён пры хламідыёзе і мікаплазмозе. Пры ганарэі праз тры-сем дзён пасля заражэння з'яўляюцца гнойныя выдзяленні, пачырваненне і пачашчанае балючае мочаспусканне. Гэта самае «папулярнае» захворванне. Цягам 10—14 дзён скаргі могуць знікнуць нават без лячэння, але радавацца рана: хвароба схавалася да часу — перайшла ў хранічную форму.

Пры трыхаманіязе першыя прыкметы захворвання з'яўляюцца ў тэрмін ад чатырох дзён да трох тыдняў пасля заражэння. Звычайна ярчэй трыхаманіяз праяўляецца ў жанчын, але даволі часта працякае без выражаных праяў як у мужчын, так і ў жанчын. Тыповыя сімптомы — сверб і раздражненне ў вобласці прамежнасці, значныя выдзяленні з непрыемным пахам.

Пры хламідыёзе праз 10—30 дзён з'яўляюцца шклопадобныя мізэрныя выдзяленні. Пры ВІЧ-інфекцыі інкубацыйны перыяд доўжыцца ад аднаго-двух да 10—15 гадоў. Чалавек можа нават не падазраваць, што інфіцыраваны. У гэты час могуць быць сімптомы, падобныя на прастуду, — тэмпература, панос, павялічаныя лімфавузлы.

— Якія сімптомы ўвогуле павінны насцярожыць?

— Найбольш характэрнымі для ІППШ з'яўляюцца выдзяленні з мочаспускальнага канала ці прамой кішкі, незвычайныя выдзяленні з похвы — істотныя ці мізэрныя, жаўтаватага колеру, або тварожыстыя, якія суправаджаюцца пахам, крывяністыя ў перыяд паміж менструацыямі; рэзь, сверб, пякота ці пачуццё дыскамфорту падчас мочаспускання, пачашчанае мочаспусканне; болі ўнізе жывата ці у вобласці паясніцы ў жанчын, у вобласці яечак у мужчын; балючыя адчуванні падчас палавога акта; язвачкі, пухіркі, эрозіі на палавых органах, у вобласці задняга праходу і ў поласці рота; сып на целе, палавых органах, падэшвах і далонях; павелічэнне лімфатычных вузлоў.

Такія праявы могуць змяншацца ці нават знікаць і без лячэння, але гэта сведчыць не пра выздараўленне, а пра пераход хваробы ў хранічную форму. Падобныя сімптомы, асабліва калі яны з'явіліся пасля выпадковай сувязі, з'яўляюцца важкай падставай для візіту да ўрача. Гэта можа быць акушэр-гінеколаг ці ўролаг тэрытарыяльнай паліклінікі або венеролаг скурнага дыспансера. Прычым толькі пасля агляду і лабараторнага абследавання можна зрабіць выснову аб наяўнасці ці адсутнасці ІППШ.

Забудзьце пра інтэрнэт!

— Якія правілы лячэння гэтых інфекцый? Ці можна самастойна набыць антыбіётык і пралячыцца?

— Варта памятаць, што ІППШ ніколі не праходзяць без лячэння. Нельга займацца самалячэннем, расцэньваць гэтыя сімптомы як «звычайныя» гінекалагічныя захворванні ці «прастуду» пасля пераахалоджання. Большасць ІППШ, акрамя СНІДу, цалкам вылечныя. Варта толькі своечасова звярнуцца да доктара. Лячэнне, як правіла, комплекснае і ўключае ў сябе антыбіётыкатэрапію, імунастымулюючыя і вітамінныя прэпараты, мясцовае лячэнне.

Для поўнага выздараўлення важна прайсці поўны курс лячэння і кантрольнае лабараторнае абследаванне. Нельга перарываць лячэнне, гэта можа прывесці да рэцыдыву хваробы ў цяжэйшай форме. Неабходна цалкам выключыць алкаголь падчас лячэння і спыніць палавыя сувязі на ўвесь перыяд тэрапіі і кантрольнага назірання. Інакш вы заразіце партнёра, а затым зноў заразіцеся ад яго.

— Калі падчас абследавання ў партнёра не выявілі інфекцыю, яму таксама варта лячыцца?

— Ні ў якім выпадку нельга забываць пра лячэнне партнёра нават у такім выпадку. Важна паведаміць яму пра неабходнасць звярнуцца да ўрача для абследавання і назначэння тэрапіі.

— Што абараняе ад інфекцый?

— Самым надзейным спосабам з'яўляецца ўзаемная шлюбная вернасць і недапушчэнне занадта ранняга палавога жыцця. Важна ўстрымлівацца ад выпадковых сувязяў. Гэтая парада распаўсюджваецца на асоб любой сексуальнай арыентацыі, бо ІППШ перадаюцца пры любых відах сексу — пры аральных, анальных і генітальных кантактах. Выкарыстоўваць прэзерватыў — гэта класічны сродак прафілактыкі. Але варта памятаць, што ён не абараняе ад інфекцый на 100 %. Важна прытрымлівацца правіл асабістай гігіены ў інтымным жыцці і патрабаваць таго ж ад партнёра. А пры ўзнікненні нават нязначных прыкмет ІППШ звяртацца да доктара.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 28 августа 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке:** лот №№ 1, 2 расположены на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9			
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14327** общей площадью **647,1** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на пять транспортных единиц с диспетчерской** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание гаража на пять транспортных единиц с пристроенной двухэтажной кирпичной диспетчерской)	**112 560,00**	5 628,00
2	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14328** общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц)	**109 080,00**	5 454,00

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, главный инженер – Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 июля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 26 августа 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

